штотыднёвая грамадска-палітычная газета

№ 19 (1615)

КУЛЬТУРА

13 мая 2023 г.

СОЦЫУМ
Захапляльнае падарожжа ў мінулае. Топ кніг для аматараў генеалогіі
стар. 4

ART - БЛОГ
Лялькі, швабра і заплечнік. Павучальная гісторыя для ўсёй сям'і
стар. 8

З ВАНДРОЎКІ
Чаму ў Пятроўны — лепш? Асабістае ўражанне ад замкавых змен
стар. 11

СПАДЧЫНА
Рэалізаваць задуму дапамог грант. Як панскі флігель у музей маляванкі ператварыўся
стар. 14-15



Мы, беларусы – мірныя людзі,
Сэрцам адданыя роднай зямлі,
Шчыра сябруем, сілы гартуем
Мы ў працавітай, вольнай сям'і.

Слаўся, зямлі нашай светлае імя,
Слаўся, народаў братэрскі саюз!
Наша любімая маці-Радзіма,
Вечна жыві і квітней, Беларусь!

ТРЫ СІМВАЛЫ — АДЗІНАЕ СВЯТА

Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна адзначаць у Беларусі 14 мая. Упершыню дата будзе прысвечана ўшанаванню адразу трох сімвалаў нацыі — адпаведны ўказ падпісаны Прэзідэнтам 12 красавіка.

Дагэтуль у нашай краіне адзначаўся Дзень Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь. Свята было ўстаноўлена ў азнаменаванне прыняцця рэспубліканскім рэферэндумам 14 мая 1995 года дзяржаўнай сімволікі і спраўлялася штогод у другую нядзелю мая ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 157 ад 26 сакавіка 1998 года.

Сёлета пра неабходнасць выправіць сітуацыю, калі дзяржаўных сімвалаў у краіне тры, а свята прысвечана толькі двум з іх, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка адзначыў у Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу 31 сакавіка. Лідар заўважыў, што дзяржаўная сімволіка Беларусі — свайго роду захавальнік гістарычнай памяці:

— І той факт, што дзяржаўных сімвалаў у нас тры (герб, сцяг, гімн), а дзяржаўнае свята прысвечана толькі двум, напэўна, гэта няправільна. Трэба выправіць недахопы.

Таксама Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што пытанні абароны нацыянальнай спадчыны — гэта задачы, на вырашэнне якіх павінна быць нацэлена ўся сфера культуры.

А 12 красавіка Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 105, якім карэкціруецца Указ ад 26 сакавіка 1998 года № 157 "Аб дзяржаўных святах, святочных днях і памятных датах у Рэспубліцы Беларусь".

Згодна з дакументам назва свята зменена з "Дзень Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь — другая нядзеля мая" на "Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь — другая нядзеля мая".

Сёлета дата прыпадае на 14 мая — па ўсёй краіне пройдуць урачыстасці. Новая назва дазволіць аддаць даніну павагі ўсім тром дзяржаўным сімвалам Беларусі.

"Разуменне глыбокага гістарычнага і палітычнага значэння герба і сцяга Беларусі, уменне выконваць наш гімн, веданне Канстытуцыі — Асноўнага Закона краіны — павінны стаць неад'емнай часткай агульнай культуры кожнага беларуса. Неабходна, каб у Беларусі сфармаваўся сапраўдны культ дзяржаўных сімвалаў. Каб яны шанаваліся ў кожным беларускім доме, уяўляючы сабой прадмет гонару і крыніцу патрыятызму".

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА

Розгалас ад акцыі

Чарговая апаратная нарада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў міністэрства адбылася 10 мая. Дзякуючы сродкам відэасувязі ўдзел у нарадзе прынялі таксама начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.

Міністр прадставіў калектыву ведамства начальніка ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Узначаліла падраздзяленне **Таццяна Жук**, якая да прызначэння займала пасаду прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Раней яна таксама працавала ў сістэме Міністэрства ўнутраных спраў і судовых органах, займала пасаду галоўнага спецыяліста аддзела архітэктуры і будаўніцтва адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска і начальніка ўпраўлення па архітэктуры і будаўніцтве адміністрацыі Савецкага раёна сталіцы.

Таксама былі разгледжаны вынікі акцыі "Ніхто не забыты, нішто не забыта", у рамках якой з нагоды Дня Перамогі было арганізавана бясплатнае наведванне дзяржаўных музеяў. Так, 8 мая музейныя ўстановы рэспубліканскага падпарадкавання наведала 17 800 чалавек, а 9 мая — 134 000, то-бок у сем разоў больш, чым зазвычай. З гэтага ліку 58 % складалі індывідуальныя наведвальнікі, а рэшта — у складзе экскурсійных груп. Мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой" наведалі 87 500 чалавек, а Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — 20 500.

Удзельнікі форуму ўсклалі кветкі да манумента "Мінск – горад-герой"

Дзеля агульнай карысці

Першы беларуска-расійскі музейны форум прайшоў у Мінску 11–12 мая. Мерапрыемства, прысвечанае супрацоўніцтву музеяў дзвюх краін, аб'яднала цэлы комплекс пляцовак для двухбаковага музейнага дыялогу.

Стартаваў форум з выставы "Дыялог з космасам", якая праходзіць у Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага, дзе можна пабачыць экспанаты з Аб'яднанага мемарыяльнага музея-запаведніка Юрыя Гагарына.

Пленарнае пасяджэнне адбылося ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Там прадстаўнікі сферы культуры дзвюх краін — кіраўнікі музеяў і супрацоўнікі турыстычных прадпрыемстваў — паразважалі аб пашырэнні міжмузейнага ўзаемадзеяння ўстаноў, аб павышэнні ролі музеяў у прадухіленні спроб перапісвання гісторыі, абмеркавалі сумесныя выставачныя праекты, неабходнасць павышэння кваліфікацыі музейных работнікаў і шмат іншага.

Выступіўшы з прывітальным словам, міністр культуры Рэспублікі Беларусь **Анатолій Маркевіч** уручыў кіраўніку расійскай дэлегацыі **Але Манілавай** нагрудны знак "За ўклад у развіццё культуры". Прывітанні дэлегатам форуму накіравалі таксама міністр культуры Расійскай Федэрацыі **Вольга Любімава** і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь **Барыс Грызлоў**. Выступілі з прывітальнымі словамі кіраўнік Прадстаўніцтва Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы ў Мінску **Мар'яна Шчоткіна**, першы намеснік Адказнага сакратара Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі **Вольга Петрашова**, дырэктар расійскага Цэнтральнага музея Вялікай Айчыннай вайны **Аляксандр Школьнік** і дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны **Уладзімір Варапаеў**.

У склад расійскай дэлегацыі ўвайшлі больш за 70 прадстаўнікоў з 18 расійскіх рэгіёнаў, адбылося падпісанне 43 пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж музейнымі ўстановамі дзвюх краін.

Акрамя таго, у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося пасяджэнне круглага стала пад старшынствам першага намесніка міністра культуры **Валерыя Грамады** і кіраўніка расійскай дэлегацыі Алы Манілавай. У сустрэчы прынялі ўдзел міністры культуры расійскіх рэгіёнаў — Ніжагародскай, Растоўскай, Яраслаўскай, Варонежскай, Тульскай абласцей і Краснадарскага краю Расійскай Федэрацыі, а таксама кіраўнікі структурных падраздзяленняў аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры.

Падчас дыялогу прагучала шмат прапаноў па арганізацыі сумесных праектаў: выстаў, канцэртаў і турыстычных маршрутаў, прадстаўнікі рэгіёнаў Беларусі распавялі пра культуру кожнай з абласцей, абмяняліся досведам работы з расійскімі калегамі, прэзентавалі свае брэндавыя культурныя мерапрыемствы і запрасілі расійскіх прадстаўнікоў актыўна ў іх удзельнічаць.

А 12 мая ў Нацыянальным гістарычным музеі ў рамках форуму прайшлі тэматычныя секцыі "Музейныя фонды Расіі і Беларусі: сучасныя метады захавання і прамоцыі музейных калекцый", "Расія і Беларусь: музейны праектны офіс" і "Музейны турызм". Для ўдзелу былі запрошаны кіраўнікі і спецыялісты вядучых музеяў абедзвюх краін, прадстаўнікі Саюза музеяў Расіі, музейных асацыяцый Беларусі, а таксама фондаў і арганізацый у сферы захавання культурнай спадчыны. Удзельнікі надалі ўвагу развіццю музейнай індустрыі ў лічбавую эпоху, абмеркавалі ўкараненне ў работу музеяў інфармацыйных тэхналогій, перспектывы рэалізацыі сумесных выставачных праектаў і навукова-асветніцкіх праграм, а таксама пытанне прыцягнення ў музеі дзяцей і моладзі. Больш падрабязны агляд работы форуму чытайце ў наступным нумары.

Па выніках працы ў 2022 годзе на рэспубліканскую Дошку гонару на плошчы Дзяржаўнага сцяга ў Мінску занесены 64 найлепшыя працоўныя калектывы краіны. У сферы культуры гэта адмыслоўцы Мемарыяльнага комплексу "Брэсцкая крэпасць-герой" і Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Кіраўнікі гэтых устаноў культуры пракаментавалі высокія дасягненні і расказалі, дзякуючы чаму здолелі дамагчыся поспеху.

Досвед лепшых

Дырэктар мемарыяльнага комплексу "Брэсцкая крэпасць-герой" **Рыгор Бысюк** перш-наперш адзначыў, што ўстанова занесена на рэспубліканскую Дошку гонару другі раз запар.

— Усе планы, якія мы перад сабой апошнія два гады ставілі, паспяхова выкананы. За гэты час у нас было каля мільёна наведвальнікаў. Толькі летась мы прынялі больш за 10 тысяч арганізаваных экскурсійных груп. Паспяхова выконваюцца намечаныя работы па добраўпарадкаванні комплексу. У гэтым нам рэгулярна дапамагаюць працоўныя калектывы, студэнты, моладзь БРСМ горада Брэста. Патрыятычнае выхаванне на прыкладзе абаронцаў крэпасці мае асаблівае значэнне. Штогод у нас праходзяць сотні мерапрыемстваў, якія садзейнічаюць фарміраванню сапраўдных патрыётаў, дастойных грамадзян нашай краіны.

Рыгор Рыгоравіч паведаміў, што ўжо прынятае рашэнне аб будаўніцтве на Кобрынскім умацаванні крэпасці Рэспубліканскага патрыятычнага цэнтра. Гэта будзе знакавае месца і для калектыву комплексу, і для моладзі ўсёй краіны. Менавіта на Кобрынскім умацаванні адбываецца 22 чэрвеня шырока вядомая рэканструкцыя. Яна прымеркаваная да Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа, пачынаецца а чацвёртай гадзіне раніцы.

Выконваць і перавыконваць устаноўленыя паказчыкі развіцця — задача няпростая. Асабліва калі казаць пра зводны паказчык — колькасць наведванняў на 1 тысячу насельніцтва. Работнікі комплексу паспяхова з гэтым спраўляюцца дзякуючы супрацоўніцтву з турыстычнымі фірмамі ды навучальнымі ўстановамі. Спрыяе і дзяржаўная палітыка. Мінулы год быў абвешчаны Годам гістарычнай памяці, бягучы — Годам міру і стварэння.

"Занясенне на Дошку гонару для нашага калектыву — яшчэ адзін стымул працаваць лепш, выконваць планы і даносіць да моладзі, наколькі важна любіць сваю краіну і быць яе патрыётам".

Дырэктар мемарыяльнага комплексу "Брэсцкая крэпасць-герой" Рыгор Бысюк

"Наш музей — першы ў свеце музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Рашэнне аб яго стварэнні было прынятае ў 1943 годзе".

Дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Уладзімір Варапаеў

Сёлета за першы квартал крэпасць наведала болей за 50 тысяч чалавек. На канец красавіка — каля 80 тысяч (колькасць нарастае). Рыгор Бысюк нагадаў, што 8—9 мая мінулага года, калі быў бясплатны ўваход, комплекс наведала за два дні каля 80 тысяч чалавек.

— Гэта была суцэльная плынь, — заўважыў дырэктар. — Нашым людзям было цяжка працаваць. Але людзі да нас ідуць. На такія аб'екты, як наш, Хатынь ды іншыя знакавыя месцы нашай краіны не павінна зарастаць народная сцежка.

Таксама ён адзначыў, што за велічэнны подзвіг абаронцаў крэпасці не застаецца ўбаку і тысячагадовая гісторыя старажытнага Брэста, прадстаўленая ў музейна-археалагічным комплексе "Бярэсце". Старажытная і сучасная гісторыі звязаныя ў агульнай прасторы. Таму філіял абласнога археалагічнага музея — адзін з самых наведвальных аб'ектаў. Цешыць, што гарадскія ўлады апошнім часам пачалі надаваць шмат увагі добраўпарадкаванню тэрыторыі археалагічнага комплексу.

— Занясенне на Дошку гонару для нашага калектыву — яшчэ адзін стымул працаваць лепш, выконваць планы і даносіць моладзі, наколькі важна любіць сваю краіну і быць яе патрыётам, — сказаў Рыгор Бысюк.

Уладзімір Варапаеў, дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, адзначыў асаблівую ролю сваёй установы ў патрыятычным выхаванні.

— Наш музей — першы ў свеце музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, — падкрэсліў ён. — Рашэнне аб яго стварэнні было прынятае ў 1943 годзе. А экспазіцыя пачала фарміравацца яшчэ раней. Экспанаты проста з фронту адпраўлялі ў Камісію па зборы дакументаў і матэрыялаў Айчыннай вайны, якая была ў эвакуацыі ў Маскве. Фактычна можна казаць пра тое, што нашая гісторыя вядзе адлік з выставы "Беларусь жыве, Беларусь змагаецца, Беларусь была і будзе савецкай", адкрытай у Маскве ў лістападзе 1942-га.

Наша музейная пляцоўка — адна з самых наведвальных у Беларусі. У 2022 годзе мы прынялі больш за 350 тысяч наведвальнікаў. Сярод іх было шмат гасцей з блізкага і далёкага замежжа.

Уладзімір Варапаеў падкрэсліў, што калектыў музея праводзіць вялікую працу па данясенні да маладога пакалення гістарычнай праўды аб вайне. З гэтай мэтай ладзяцца экскурсіі, выставы, музычныя і літаратурныя вечарыны, квэсты, выязныя мерапрыемствы, кінапаказы. Усё часцей тут бачаць моладзь. Таму навуковыя супрацоўнікі ствараюць адмысловыя інтэрактыўныя тэматычныя праграмы з выкарыстаннем элементаў рэканструкцыі і новых тэхналогій. Гэта садзейнічае глыбокаму эмацыянальнаму ўспрыманню, знаёміць маладых наведвальнікаў з гісторыяй і падзеямі вайны.

Па словах Уладзіміра Варапаева, сёлета музей ладзіць шмат цікавых мерапрыемстваў. Напрыклад, тыдзень таму адбылося ўрачыстае адкрыццё часовай экспазіцыі "Слова пра героя", прысвечанай 89-й гадавіне заснавання звання Героя Савецкага Саюза і прымеркаванай да 9 Мая. Яна створана на аснове фондавых матэрыялаў музея (фатаграфій, дакументаў, асабістых рэчаў), якія суправаджаюцца вершамі расійскага паэта Мікалая Басава, прысвечанымі канкрэтным героям Вялікай Айчыннай вайны. Усе яны звязаныя з беларускай зямлёй.

Вечарам 5 мая адбылася прэм'ерная літаратурна-музычная вечарына "Жывое дыханне памяці". Супрацоўнікі музея правялі наведвальнікаў па экспазіцыі, цытуючы арыгінальныя гістарычныя дакументы ваеннага часу і ствараючы адмысловую тэатралізаваную атмасферу. Ім дапамагалі студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М.І. Глінкі.

Напярэдадні Дня Перамогі ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ўрачыста адкрылі часовую экспазіцыю "Савецкая ваенная форма і знакі адрознення 1920—1950-я гг.)". Яе аснову складае частка з асабістай калекцыі Станіслава Іванавіча Ускова, які збірае прадметы ўніформы СССР больш за 15 гадоў. Першымі наведвальнікамі сталі курсанты Акадэміі МУС, Інстытута пагранічнай службы, Ваенна-медыцынскага інстытута БДМУ, а таксама члены патрыятычнага клуба "Будзем памятаць".

Уладзімір Варапаеў запэўніў, што калектыў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і надалей будзе беззаганна выконваць сваю высакародную місію — захоўваць гістарычную памяць аб цяжкіх выпрабаваннях і гераізме нашага народа.

Віктар ГАЎРЫШ
Фота аўтара

Праваднікі па гісторыі вашага роду

Як кнігі дапамагаюць шукаць продкаў?

“Бібліяноч”, што прайшла напрыканцы красавіка ў Беларусі, прыцягнула ўвагу мноства гасцей. Адбыўся цэлы шэраг лекцый, цікавых як чытачам-аматарам, так і адмыслоўцам. Да прыкладу, у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук старшы навуковы супрацоўнік сектара навуковай апрацоўкі рукапісаў аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Вадзім Урублеўскі распавёў пра найважнейшыя выданні, якія могуць спатрэбіцца кожнаму ў даследаванні ўласнага радаводу.

Гэтыя кнігі па антрапаніміцы, вуснай гісторыі, архівазнаўстве, генеалогіі, некрапалістыцы, археаграфіі, гісторыі штодзённасці, рэгіянальнай гісторыі і іншых дысцыплінах прама ці ўскосна асвятляюць карціну сямейна-родавых сувязей нашых продкаў. Названыя даведнікі даступныя ў бібліятэках ды кнігарнях і здольныя значна аблегчыць стварэнне генеалагічнага дрэва. Сустрэча адбылася ў рамках цыкла лекцый па генеалогіі, які сёлета ладзіцца ў ЦНБ НАН пры падтрымцы Савета маладых вучоных Інстытута гісторыі.

ІМЁНЫ

Пачаць можна з выданняў, прысвечаных антрапаніміцы — то-бок паходжанню імёнаў, прозвішчаў і мянушак. У гэтай галіне варта звярнуць увагу на навуковую спадчыну філолага Мікалая Бірылы, які працаваў у пасляваенныя гады, і Аляксандра Рогалева, што сёння жыве і выкладае ў Гомелі. Другі даследчык — аўтар этымалагічнага слоўніка беларускіх прозвішчаў, які пабачыў свет у 2016 годзе. Таксама можна азнаёміцца з працай Валянціны Лемцюговай і Ірыны Гапоненка “Карані нашых прозвішчаў”, складзенай з адказаў на пытанні чытачоў. Прытым варта ўлічваць: цягам пакаленняў прозвішчы маглі зменяць формы і нават згадвацца ў розных варыянтах у адну эпоху.

АРХІВЫ

Дапамагчы ў пошуках каранёў здольныя таксама кнігі, прысвечаныя архівам, — напрыклад, даведнік па фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, які быў выпушчаны летась. Праца над выданнем вялася 15 гадоў. Самі ж вопісы сховішчаў цяпер алічбаваныя і даступныя на сайце ўстановы. Наогул жа вызначыцца, у якіх архівах трэба шукаць інфармацыю аб тым ці іншым населеным пункце, з якога паходзілі вашы продкі, можна, скарыстаўшы пошук па фондавым каталогу на сайце “Архівы Беларусі”.

САСЛОЎІ

Шэраг генеалагічных даведнікаў прысвечаны паходжанню прадстаўнікоў пэўных сацыяльных груп. Гэта кнігі, што распавядаюць аб гісторыі буйных магнацкіх родаў (Алелькавічаў, Валовічаў, Ільінічаў і г. д.), выпушчаныя Цэнтрам генеалагічных даследаванняў, які дзейнічаў пры Інстытуце гісторыі НАН, альбо біяграфічнае выданне, што змяшчае інфармацыю аб мінскіх губернатарах, віцэ-губернатарах і губернскіх маршалках шляхты часоў Расійскай імперыі, падрыхтаванае ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі Юрыем Снапкоўскім, ці серыя кніг, створаная Фёдарам Чарняўскім, з пасадамі і тытуламі ўраднікаў Менскага ваяводства XVI—XVIII стагоддзяў.

“Гербоўнік беларускай шляхты” — яшчэ адзін маштабны праект, які рэалізоўваецца ўжо больш за 20 гадоў Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі. Зборнік адлюстроўвае звесткі аб шляхце Мінскай губерні, якія ўтрымліваюцца ў справах фонду Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу. Кожны том выдання прысвечаны прозвішчам на пэўную літару. На сёння свет пабачылі ўжо восем кніг — да “К”. Калі пры падрыхтоўцы першых тамоў укладальнікі часта сутыкаліся з праблемай фальсіфікацыі радаводаў, то цяпер гэты аспект улічваецца больш пільна і інфармацыя адмыслова верыфікуецца.

Пра землеўладальнікаў Мінскай губерні 1861—1917 гадоў расказваюць даведнікі, укладзеныя аспірантам НАН Дзмітрыем Драздом, якія змяшчаюць, між іншага, такія каштоўныя для генеалагічных росшукаў дакументы, як справы аб выкупе сялянамі зямлі ў памешчыкаў. Спісы шляхты Магілёўшчыны і Віцебшчыны былі апублікаваны даследчыкам Аляксандрам Залівакам, спісы шляхты і сялян XVIII стагоддзя па некаторых паветах падрыхтаваў гісторык Яўген Анішчанка. Пра паходжанне шляхты Ашмяншчыны распавядае цэлы шэраг даведнікаў, укладзеных Васілём Юршам.



Тым жа, хто мае яўрэйскія карані, варта звярнуць увагу на выданне Эдуарда Рабіновіча “Фамилии, основы родословных евреев Минской губернии в XVIII — начале XX века”. Дзяніс Лісейчыкаў у 2015 годзе выпусціў кнігу “Святар у беларускім соцыуме”, якая змяшчае багата звестак аб грэка-каталіцкіх свяшчэннікаў, многія з якіх пасля перайшлі ў праваслаўе. А Дзмітрый Матвейчык у 2016-м уклаў біяграфічны даведнік аб паўстанцах 1863—1864 гадоў, які змяшчае інфармацыю аб даце і месцы нараджэння інсургентаў, адукацыі, сацыяльным статусе, лёсе падчас і пасля паўстання, а таксама аб секвестрацыі маёнткаў.

БАЗЫ ЗВЕСТАК

Генеалагічныя дадзеныя па XX стагоддзі даволі шырока прадстаўлены ў інтэрнэце. Там можна лёгка знайсці базы звестак аб удзельніках Першай сусветнай, аб рэпрэсаваных у савецкі перыяд, удзельніках Вялікай Айчыннай вайны, вайны ў Афганістане і г. д. Такая ж інфармацыя ўтрымліваецца і ў кнігах серыі “Памяць”, кожная з якіх прысвечана пэўнаму раёну Беларусі, — гэтыя тамы пачалі з’яўляцца яшчэ ў савецкія часы.

Пошук звестак пра ўласных продкаў можа зрабіцца пачаткам захапляльнага падарожжа ў мінулае. І паспрабаваць свае сілы ў гэтай справе, можа кожны — варта толькі звярнуцца да адпаведнай літаратуры.

Важны памочнік у вызначэнні кірунку архіўных пошукаў — серыя кніг “Гарады і вёскі Беларусі”, якая выходзіла з 2004 года дбаннем Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН у выдавецтве “Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі”. У даведніку на падставе найноўшых архіўных і іншых крыніц адлюстраваны гісторыя і сучасны эканамічны ды культурны стан адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак Беларусі, а таксама ўсіх населеных пунктаў кожнага раёна, уключаючы тыя, што перасталі існаваць. Тамы серыі дапамогуць сарыентавацца, да якога павета і губерні, царкоўнага прыхода ці касцельнай парафіі адносілася тое ці іншае мястэчка, дзе жылі вашыя продкі, каб далей паглыбіцца ў метрычныя кнігі ці іншыя дакументы адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі.

Пошук звестак аб продках можа зрабіцца пачаткам захапляльнага падарожжа ў мінулае, і паспрабаваць сілы ў гэтай справе, як бачым, здольны кожны — варта толькі звярнуцца да адпаведнай літаратуры. Зычым рызыкнуць і пацікавіцца — верагодна, у выніку вы не толькі ўзбагаціце веды пра ўласны радавод, але і папоўніце шэраг апантаных аматараў генеалогіі.

Антон РУДАК

Напісаны жыццём кінасцэнарый

Гомельскі гарадскі цэнтр інклюзіўнай культуры да Дня Перамогі прэзентаваў фільм “Дзеці вайны”. Карціна адлюстроўвае лёсы трох жанчын, чые дзяцінства і юнацтва прыпалі на Вялікую Айчынную. Народная стужка зроблена творцамі-самавукамі без буйнога бюджэту, але выніку пазайздросцяць нават профі тэлеэфіру.

“Мама сказала: «Ідзі вазьмі ступу і таўчы кашу». І раптам немец ідзе. Сеў, закінуў нагу на нагу і навёў на мяне пісталет. Я спужалася, кінула ўсё і збегла. Схавалася ў прыбіральні і доўга там сядзела, доўга. А мама шукала мяне. Увечары я ўбачыла, што нікога ўжо няма, і праз акно залезла ў хату. Мама так узрадавалася... Дзякуй богу, што знайшлася”. Гэта толькі адзін са страшных эпізодаў, якія ў вайну перажыла Лілія Аляксейкава. І на 91-м годзе яна ў дробязях згадвае цяжкае маленства. Успаміны Ліліі Мяфодзьеўны, а таксама Клаўдзіі Іванаўны Сяргеевай (95 гадоў) і Інесы Уладзіміраўны Шыркоўскай (93 гады) склалі аснову фільма “Дзеці вайны”.

ДАКУМЕНТ І РЭКАНСТРУКЦЫЯ

Рэжысёр Дзмітрый Нячаеў не хавае, што праект пачынаўся з прапановы зняць ваенную работу на конкурс. Каб прапазіцыя паступіла камусьці іншаму, можа, і атрымалася б “датнае” кіно “на адзін раз”. Дзмітрыю ж халтурыць не даспадобы. Творцу важна, каб стужка мела доўгае жыццё і адгукнулася масавай аўдыторыі, а не толькі вузкаму колу суддзяў. Задача надзвычай складаная, асабліва калі рэсурсы ў пастаноўшчыка абмежаваныя. Вакол патэнцыйнага гледача столькі відовішчаў, а яму трэба адкласці забаўкі і цярпліва выслухаць балючыя ўспаміны незнаёмца. Пагадзіцеся, 30-хвілінны маналог успрымаецца цяжка, якой бы праніклівай ні была гісторыя. Для зумераў такая карціна ўвогуле надзвычайнае выпрабаванне.

Каб пазбегнуць прэснасці і ўтрымаць чалавека ля экрана, аўтар звярнуўся да дакудрамы — гібрыднай формы на мяжы дакументальнага і ігравога кіно. У фільме чаргуюцца фрагменты інтэрв’ю з удзельнікамі вайны і пастановачныя сцэны — рэканструкцыя сапраўдных гістарычных падзей. Гэтыя ілюстрацыі даюць адчуць, няхай не ў поўнай меры, страх, смутак і радасць Перамогі, што зазналі гераіні. Дасягаецца такі эфект за кошт руплівай працы акцёраў-аматараў, дбайнага падбору натуры, дэкарацый, рэквізіту і касцюмаў. Глядач нібы вяртаецца з дзецьмі вайны ў вогненныя гады: трапляе ў акупаваны горад і лясны партызанскі лагер, пражывае бамбёжкі, здзекі, а таксама гібель блізкіх, сустракаецца з самааддананасцю і здрадай.

ПАДАРОЖЖА Ў ЧАСЕ

Кіно дазваляе прайсці з гераінямі шлях ад першых бамбардзіровак да пераможнай вясны. Здаецца, канва падзей знаёмая. Мы чулі ад сваякоў ці чыталі аб разбуранных, страшным голадзе, забойствах мірнага насельніцтва. Але ж досвед кожнага чалавека адметны. Нідзе больш не знайсці ідэнтычных успамінаў пра паходы на партызанскія заданні, пра пошукі хоць нейкіх харчоў, пра ўбачаны ў маленстве расстрэл землякоў. Нарэшце, пра сустрэчу ўжо пасля трагедыі з суседкай, якой у ліхалецце пагарджалі, бо любілася з немцамі. Як паказвае жыццё, высновы бываюць заўчаснымі.

У экспазіцыі і эпілогу паўстаюць сучасныя кадры. Пачынаецца карціна тым, што Інеса Шыркоўская наведвае родную даваенную хату. Завяршаецца рэпартажным відэа: Гомель святкуе чарговую гадавіну Перамогі, дзеці бескляпотна бавяць час на гульнявой пляцоўцы. Кантраст з рэканструяванымі ваеннымі эпізодамі і хронікай падмацоўвае звышідэю стужкі, заключаную ў рэпліцы Клаўдзіі Сяргеевай: “Трэба берагчы мір”.

КІНАТАЛАКА

Без перабольшання, праект атрымаўся народным. Дзмітрый Нячаеў здолеў захвоціць да ўдзелу ў фільме людзей розных прафесій і ўзростаў. У пастаноўчых сцэнах здымаліся дзеці работнікаў Цэнтра інклюзіўнай культуры і людзі з інваліднасцю, якія наведваюць арганізацыю. Пагадзіліся дапамагчы камандзе і сябры клуба рэканструкцыі “Памяць” — яны выконвалі ролі нямецкіх салдат. Вядома, праца з аматарамі мае свае цяжкасці. Некаторых акцёраў даводзілася замяняць непасрэдна падчас здымак.

Таксама да праекта падключыліся прафесіяналы: мастаком па святле выступіў Павел Антонаў, а кампазітар Дзмітрый Жур бясплатна прапанаваў творы для музычнага афармлення карціны. “Я веру ў тое, што рабіў. Верагодна, гэтая вера перадалася сябрам, знаёмым. І думаю, яны не пашкадавалі, што далучыліся”, — дзеліцца Дзмітрый Нячаеў.

САБРАЦЬ КОЛА АДНАДУМЦАЎ

Пасля прэм’еры на вялікім экране фільм “Дзеці вайны” паказалі ў святочным эфіры рэгіянальнага тэлеканала “Беларусь 4. Гомель”. Стваральнікі плануюць прэзентаваць работу на конкурсах, а пасля апублікаваць у адкрытым доступе.

Мяркуецца, што першая буйная стужка кінавідэастудыі “Ракурс” стане прыступкай да запуску своеасаблівай кінафабрыкі ў Гомелі. Дзмітрый Нячаеў упэўнены, што творчая індустрыя мае права на жыццё ў абласным цэнтры — выязджаць у сталіцу ці за мяжу неабавязкова. Маленькімі крокамі кіраўнік студыі ідзе да сваёй мэты. Ён бачыць “Ракурс” аб’яднаннем здольных да каманднай працы энтузіястаў, гатовых спасцігаць майстэрства на практыцы, непасрэдна на здымачнай пляцоўцы, а не за партамі. Калі ж калектыў заручыцца і фінансавай падтрымкай, можна будзе чакаць яркія прэм’еры: тэлевізійныя праграмы, фільмы-казкі і нават псіхалагічнае кіно.

Даніл ШЭЙКА

На фота кадры з фільма

Глядач нібы вяртаецца з дзецьмі вайны ў вогненныя гады: трапляе ў акупаваны горад і лясны партызанскі лагер, пражывае бамбёжкі, здзекі, гібель блізкіх, сустракаецца з самааддананасцю і здрадай.

Маэстра Сасноўскі — душа аркестра

Саліст беларускай дзяржаўнай філармоніі Аляксандр Данілаў (раяль) у юбілейным канцэрце Сімфанічнага аркестра Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы "Нам ХХХ"

Аляксандр Сасноўскі: “Маё крэда – пастаянства”

Сімфанічны аркестр Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы сёлета святкуе трыццацігоддзе. І чвэрць стагоддзя ім кіруе дырыжор Аляксандр Сасноўскі. Яго крэда — пастаянства, вернасць справе. Менавіта гэтыя якасці даюць найлепшы вынік, лічыць наш суразмоўца.

— Аляксандр Пятровіч, трыццаць гадоў — шмат ці мала?

— Гэта быццам бы невялікі прамежак часу. Але для такога творчага арганізма, як сімфанічны аркестр, — значны тэрмін. Бо наша праца — найскладанейшая форма сумеснага музіцыравання. Пройдзены шлях у асэнсаванні, станаўленні, засваенні сусветнага класічнага рэпертуару. Праведзеная вялікая работа. Адпрацавана шмат папулярнай класічнай музыкі. Гралі і Шастаковіча, і Стравінскага. Плюс вялікі пласт аперэты. Выступалі акампаніятарамі, памагатымі выбітных вакалістаў. Вакальны рэпертуар намі засвоены вельмі прыстойна. І мы разумеем, што знаходзімся на правільным шляху. І доказ таму — аншлагі. Калі глядач да нас ідзе, значыць, мы ўсё робім правільна. А цікавасць і ўвага гледача — гэта вялікі стымул. І ведаеце, што цяпер адбываецца ў Брэсцкім акадэмічным тэатры драмы? Мы не толькі ў маштабах Беларусі, але ўсёй СНД адзіны драматычны тэатр, у сценах якога паўнавартасна працуе сімфанічны аркестр. Гэта атрымалася воляй лёсу, выпадкова. Але ўжо ніводны дырэктар, цяперашні ці будучы, не захоча з гэтым багаццем расстацца.

"Маё крэда — пастаянства ў тым, што я займаюся сваёй справай. Справай, патрэбнай людзям".

— Кіраўніцтва не лічыць аркестр абузай?

— Цяперашняе кіраўніцтва — маладое і таленавітае, гендырэктар Ганна Уладзіміраўна Сянькавец актыўна прыцягвае нас да праектаў. Раней мы фрагментарна ўдзельнічалі ў працэсе, а цяпер працуем вельмі шчыльна. Удзельнічалі ў афіцэрскім балі, мерапрыемствах да Міжнароднага дня тэатра і гэтак далей. Ужо ёсць сумесныя напрацоўкі з акцёрамі тэатра, гэта правільны шлях.

Наш аркестр — жывы творчы арганізм, які актыўна і хутка развіваецца. У рэпертуары калектыву больш за 300 твораў розных аўтараў. У складзе аркестра 56 найлепшых музыкантаў Брэста — людзей творчых, па-сапраўднаму ўлюбёных у музыку. Наша канцэртная афіша незвычайна шматаблічная. У праграмах апошніх гадоў прадстаўлены шэдэўры айчыннай і замежнай музыкі: “Паненка і хуліган” Д. Шастаковіча, “Арлезіянка” Ж. Бізэ, “Рапсодыя ў стылі блюз” Дж. Гершвіна, “Балеро” М. Равеля, творы А. Барадзіна, П. Чайкоўскага, М. Мусаргскага і многіх іншых кампазітараў.

— Сімфанічны аркестр — шырока распаўсюджаная з’ява ў Беларусі?

— Не. Ёсць у Віцебску і Гомелі, дзе, дарэчы, з 2014 года працуе мой вучань, галоўны дырыжор Мурад Асуіл. А ў Магілёве і Гродне — капэлы. У брэсцкага аркестра даўнія традыцыі, ён поўнасцю ўкамплектаваны. І ў гэтым перавага. Да таго ж я доўгі час тут працую — сталасць ды стабільнасць дае вынік. А калі мяняюцца кіраўнікі, ідзе нейкая кадравая чахарда, шкодна для справы.

— Якія прыярытэты сёння ў Сімфанічнага аркестра Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы?

— Каб прыцягваць публіку, мы пастаянна аднаўляем рэпертуар, імкнёмся не паўтарацца. Нацэленыя на тое, каб быць цікавымі моладзі. Бо музыка выхоўвае, прымушае думаць, перажываць, любіць. Вось у канцы гэтага месяца рыхтуемся прадставіць вялікі канцэрт памяці кампазітара Арно Бабаджаняна.

— Ваша праца з моладдзю звязана не толькі з аркестрам…

— Так, я шмат увагі надаю педагагічнай дзейнасці. На пачатку красавіка мая вучаніца Валерыя Курловіч заваявала дыплом Лаўрэата I ступені прэстыжнага конкурсу Расійскай акадэміі музыкі імя Гнесіных. Яна стала найлепшай у намінацыя “Дырыжыраванне аркестрам духавых інструментаў” сярод студэнтаў вышэйшых прафесійных навучальных устаноў Расіі. Трэба адзначыць, што гэта вельмі таленавітая дзяўчына. Цяпер яна студэнтка чацвёртага курса Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Прычым яе асноўная спецыяльнасць — віяланчэль. Дырыжыраваннем мы з ёй займаемся факультатыўна.

— Ці ўплываюць на вас падзеі, так бы мовіць, у краіне і ў свеце?

— Час цяпер неспакойны. І чалавек мастацтва нікуды не схаваецца. Усё навідавоку. Я ў аркестры працую 25 гадоў, у Акадэміі музыкі — 38. Маё крэда — пастаянства ў тым, што я займаюся сваёй справай. Справай, патрэбнай людзям.

Я лічу і заўсёды лічыў, што трэба працаваць і творчасцю даказваць, што жыццё цудоўнае. Кожны павінен займацца сваёй справай. Мітусяцца, паддаюцца на правакацыі нейкія тыя, хто не можа сябе рэалізаваць. А каб рэалізаваць сябе, трэба ў першую чаргу быць спецыялістам, майстрам сваёй справы. Сапраўдным прафесіяналам…

"Трэба працаваць і творчасцю даказваць, што жыццё цудоўнае. Кожны павінен займацца сваёй справай. Каб рэалізаваць сябе, трэба ў першую чаргу быць прафесіяналам, майстрам сваёй справы".

Віктар ГАЎРЫШ
Фота: БЕЛТА

Калектыў прымае актыўны ўдзел у музычным жыцці Брэста

Паказ беларускага фільма “Падрыў” праходзіць у гарадах Расіі.

Не варажы на рамонку, а ідзі да мар

Беларуская эстрада заўсёды жадае адкрыць новыя імёны. І ў апошнія гады мы бачым мноства маладых выканаўцаў на вялікай сцэне. Але вось ці ўспомніцца хоць бы адна песня... Ды гэта не пра нашу новую гераіню. Дзевятнаццацігадовая Анастасія Краўчанка запомнілася гледачу сваімі яркімі вобразамі і моцным вакалам. Як склаўся лёс экспрэсіўнай спявачкі пасля нашумелага шоу “X-Factor”, расказвае сама дзяўчына.

“Выступаю на вялікай сцэне з шасці гадоў. Самы значны праект, які даў мне ўсё, што ў мяне цяпер ёсць, – шоу “X-Factor”. Таксама на маю творчасць моцна паўплывалі праект “Залятай у трэнды”, “Песня года Беларусі” і “Песня года” ў Маскве. Самая значная ўзнагарода – перамога на міжнародным конкурсе “Malta International singers festival””

— Анастасія, распавядзіце пра сваё дзяцінства. Якія ў вас былі захапленні і адкуль схільнасць да спеваў?

— З чатырох гадоў я займалася ў разнастайных гуртках: акрабатыка, спартыўная гімнастыка, вакал, фігурнае катанне, акцёрскае майстэрства. Фішка ў тым, што ў мяне ўсё атрымлівалася, таму ніякае хобі я не кідала, і ў нейкі момант маю маму гэта пачало насцярожваць. Спяваць пачала ў пяцігадовым узросце і паралельна займалася ў дзвюх вакальных студыях. А ўжо ў пятым класе ў маім жыцці з’явілася музычная школа. Памятаю, што не вельмі любіла яе наведваць, але яна знаходзілася у трох хвілінах хады ад дома, і, відавочна, гэта быў знак. Захапляюся, калі людзі граюць на музычных інструментах, але сама гэтага рабіць не ўмею і не хачу. Мая душа навекі належыць толькі вакалу. А зусім маленькай марыла стаць пракурорам, бо маім любімым серыялам быў “Мухтар”.

— Каго вы лічыце сваім першым настаўнікам у свеце музыкі?

— Пасля пераезду ў аграгарадок Сеніца з 7 па 11 клас займалася вакалам у першых прадстаўнікоў Беларусі на Еўрабачанні — дуэта “Аляксандра і Канстанцін”. З імі пачалася мая конкурсная дзейнасць, і я наведала шмат краін.

— Давайце пагаворым пра праект “X-Factor”, які падарыў вам вялікую папулярнасць сярод беларускай публікі. Як прыйшла ідэя паўдзельнічаць у конкурсе і што вам запомнілася больш за ўсё? Што адчувае фіналістка такога маштабнага шоу?

— Помню перыяд, калі быў застой у творчым жыцці. Для дзіцячых конкурсаў стала ўжо, бадай, дарослай, а для больш сур’ёзных заставалася дзіцём. Шаснаццаць гадоў — неакрэслены ўзрост для такой сферы. Доўга разважала, ці трэба мне браць удзел у такім праекце, бо з крутымі ўзнагародамі, высокімі пазіцыямі я прыязджала толькі з-за мяжы. У Беларусі мяне ніколі не заўважалі на падобных мерапрыемствах. Вядома, гэта моцна раніла і пакінула адбітак. Але мама сказала, маўляў, што мы губляем? Такім чынам, я адправілася на перадкастынг у Баранавічы, а потым і ў Мінск. Удзячная, што тады скарысталася гэтым шанцам.

З кожным выступленнем на “X-Factor” звязаны ўнікальныя ўспаміны. Адзін з яркіх момантаў: пяты прамы эфір, калі з пяці ўдзельнікаў абіралі тройку суперфіналістаў. Я спявала кампазіцыю “Cryin’” і была ў дзёрзкім вобразе каўбоя. Гэта было незвычайна, бо ўсе прывыклі бачыць мяне мілай і добрай або сумнай і містычнай. А тут я была нахабнай дзяўчынай, якая ходзіць па стале і пхае нагой хлопца з падтанцоўкі. Такога досведу ў мяне не было, таму ён добра адбіўся ў памяці. Калі пачула, што стала суперфіналісткай, я проста на сцэне ўпала на калені. І ўсё было як у тумане: шум, апладысменты, супакойлівыя словы вядучай. Відэа з гэтым момантам разляцелася па ўсіх сацыяльных сетках. Уяўляеце: кожны тыдзень ты стаіш у чаканні гэтых вынікаў і настае самы вырашальны момант, а ў галаве толькі адно пытанне: ці прайшла ты далей? Гэта быў мільён бясконцых эмоцый, якія мяне проста разрывалі!

— Як разгортваліся падзеі пасля фіналу? І як вынік праекта паўплываў на вашу кар’еру?

— Усе падзеі скончыліся 25 снежня 2021 года, і я не разумела, што будзе далей. Нам абяцалі запісы песень, пастаянныя канцэрты. Праз сваю недаверлівасць я сумнявалася ў праўдзівасці гэтых слоў. Але ўжо шостага студзеня быў запіс маёй першай песні. Потым часовае зацішша, аднак нават у гэты перыяд я паспела выступіць на канцэрце, прысвечаным 9 мая. У той дзень мне споўнілася васямнаццаць гадоў, і я адзначыла дзень нараджэння на плошчы Перамогі, займаючыся сваёй любімай справай. Улетку ў нас пачаўся тур па гарадах Беларусі, потым шматлікія выступы на фестывалях на вольным паветры. Увогуле, жыццё зайграла новымі яскравымі фарбамі!

Гэты праект моцна паўплываў на маю будучыню: уласныя песні, канцэрты, аўдыторыя, пазіцыі ў чартах. Нават тое, што вы цяпер бераце ў мяне інтэрв’ю, — усё гэта вынікі майго ўдзелу ў “X-Factor”.

— А з кім з настаўнікаў і ўдзельнікаў праекта вы да гэтага часу падтрымліваеце сувязь?

— Вядома ж, са сваім настаўнікам Сяргеем Васільевічам Суседавым, а таксама з Русланам Фёдаравічам Аляхно. З удзельнікамі шоу мы знаходзімся ў адной прадзюсарскай кампаніі, таму ўвесь час камунікуем. Усе непрыемнасці, канкурэнцыя забываюцца, маем выдатныя стасункі.

— Летась вы сталі ўдзельніцай шоу “Залятай у трэнды”. Раскажыце пра досвед удзелу ў расійскім тэлевізійным праекце.

— Для мяне гэта было глытком свежага паветра. Якім бы крутым ні падаваўся “X-Factor”, там мы выконвалі толькі каверы. А на “Залятай у трэнды” ты праяўляешся як артыст і знаёміш слухачоў са сваёй творчасцю.

У канцы жніўня мяне запрасілі на прагляд у Маскву. І з верасня да снежня кожны месяц я ездзіла на здымкі на кінастудыю Amedia. Першапачаткова быў аб’яўлены прыз фіналістам — гэта фіты (сумеснае выкананне трэка) з настаўнікамі, імёны якіх мы даведаліся толькі ў дзень першых здымак. Але мне было ўсё роўна, таму што я разумела: магу праспяваць рок, поп, нават рэпчык зачытаць. Як гаворыцца, бачу мэту — не бачу перашкод.

Калі абвясцілі спіс журы, адразу зразумела, што Мія Бойка — настаўніца, якая мне патрэбная. Нягледзячы на тое, што гэта мой другі буйны тэлевізійны праект, моцнай упэўненасці не адчувала. Як ні круці, Беларусь — родная краіна, а тут усе чужыя і здаюцца такімі рашучымі. У праект прайшлі яшчэ чатыры ўдзельнікі з “X-Factor”. І мы думалі: як добра, што мы тут разам, ідзём поплеч.

Вынікам конкурсу стаў фіт “Фіялетава” з Міяй Бойка. Гэтая кампазіцыя — круты паказчык усіх чатырох месяцаў працы. Калі зразумела, што ўсе сем фіналістаў будуць выконваць дуэты з настаўнікамі, перамога стала для мяне не асноўнай мэтай. Мія выбрала мяне ў свой топ-3, і я вельмі ўдзячная за тое, што яна вырашыла ўзяць у каманду звычайную беларускую дзяўчыну і запісала з ёй песню.

— Апроч фіта “Фіялетава” ў вас ёсць некалькі ўласных кампазіцый. Калі мы можам чакаць новых рэлізаў?

— Так, у мяне ўжо ёсць свае песні: “Па палюшку”, “Рамонкі”, “Цырк”. Ужо дзве песні запісаныя і проста чакаюць свайго выхаду ў зручны момант. Але іх пішу не я. Сама складаю глыбокія, сэнсавыя, магчыма, недзе сумныя творы, якія пакуль не адпавядаюць майму вобразу. Пакуль што яны ляжаць у стале, і, магчыма, праз 10-15 гадоў я прадстаўлю іх шырокай аўдыторыі. Цяперашнія мае песні падабаюцца больш дзіцячай аўдыторыі, таму на дадзены момант мяне ўсё задавальняе.

— Што вы адчуваеце падчас выступаў на сцэне?

— Канцэрты — энергаабмен паміж мной і публікай, дзе я аддаю ўсе сілы. Падчас выступаў перад дарослай аўдыторыяй на афіцыйных мерапрыемствах я не бачу падтанцоўваючых гледачоў. Разумею, што па этыкеце яны не могуць сабе дазволіць скакаць і адбіваць рытм пад мае трэкі. Але пасля такіх мерапрыемстваў адчуваю сябе як выціснуты лімон. Вельмі люблю адкрытыя канцэрты, калі людзі не саромеюцца актыўнічаць: танцуюць, падпяваюць і фатаграфуюць.

— Пасля такіх буйных праектаў вы набылі вялікую колькасць фанатаў і вядомасць. Ці паўплывала гэта нейкім чынам на вашы паводзіны?

— Многія расказваюць, што пасля такіх шоу пачынаюць задумвацца аб сваіх дзеяннях і больш сціпла паводзіць сябе на публіцы. Я застаюся самой сабой заўсёды. Напрыклад, іду па горадзе ў кампаніі сваіх сяброў, гучна смяюся і шмат жэстыкулюю. Унутрана мяне нічога не стрымлівае. У мяне самыя лепшыя фанаты, якія поўнасцю мяне прымаюць і падтрымліваюць літаральна ва ўсім. Яны любяць манціраваць са мной розныя відэа і выкладваць у сацыяльныя сеткі — вядома, гэта вельмі замілоўвае.

— Прыадкрыйце заслону і падзяліцеся з чытачамі газеты “Культура” творчымі планамі!

— Збіраюся выпусціць яшчэ больш хітовых песень, якія заляцяць у вашы сэрцайкі, запоўніць сваёй творчасцю ўсе радыёстанцыі і трэнды TikTok. Вельмі хацелася б запісаць альбом да канца года і проста развівацца як артыст, а таксама нарошчваць аўдыторыю.

— Якую параду можаце даць маладым выканаўцам, што да гэтага часу шукаюць сябе?

— Калі знаходзіцеся ў пошуках сябе, гэта забірае шмат вашай энергіі, якую можна ўкласці ў дзеянне. Выбіраеце паміж рок-, джаз-, поп-музыкай? Ды спрабуйце ўсё! Навошта марнаваць час на разважанні? Проста рабіце — і самі зразумееце, да чаго ляжыць душа.

Настасся ЮРКЕВІЧ

Фестываль “Арт-Мінск-2023” стартуе ў Палацы мастацтва.

“Незвычайныя прыгоды...” без нагоды

Магілёўскі абласны тэатр лялек выпусціў прэм’еру — “Незвычайныя прыгоды Насцюшы і Мікіткі”. Спектакль стаў чарговым выпрабаваннем на творчую сталасць маладога рэжысёра Марыі Гуцавай.

Нядаўняя выпускніца Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, **Марыя Гуцава** сама напрасілася ставіць не канцэртныя праграмы, а менавіта спектаклі. І менавіта ў тэатры лялек. Слушны выбар! Бо лялькі і наогул эстэтыка такіх тэатраў, звернутая да разнастайныхператварэнняў і працы з прадметным светам, не забываючыся на людзей, дае папраўдзе незвычайныя і неверагодныя магчымасці для “прыгод” творчай фантазіі. Імя рэжысёркі аказалася на слыху пасля леташняй прэм’еры “Магіла льва”, што была паказаная таксама на XVI Міжнародным маладзёжным тэатральным форуме “М.@rt.кантакт” у Магілёве. І вось — чарговая праца. Гэтым разам — для дзяцей 6+. Вядома, разам з дарослымі! Бо гэты спектакль будзе карысны найперш для бацькоў, якія часцяком “прапускаюць” большую частку дзяцінства сваіх нашчадкаў. А там, акрамя “паесці-апрануцца”, столькі падзей і прыгод! Уяўных і рэальных. Невыпадкова спектакль пазначаны як “павучальная гісторыя для ўсёй сям’і”.

За аснову было ўзята невялічкае апавяданне Аляксея Талстога “Як ні ў чым не бывала”, упершыню надрукаванае ў 1925-м. Але ад яго засталіся хіба самыя агульныя абрысы сюжэта: дзеці, не адчуваючы ўвагі бацькоў, вырашаюць выхоўваць сябе самастойна — і выпраўляюцца ў небяспечнае падарожжа на лодцы па рацэ. Ну, можа, захавана яшчэ пара-тройка фраз у дыялогах. Змяніліся нават героі! Замест двух братоў з дастатковай узроставай розніцай узнікаюць брат з сястрой — амаль што пагодкі. І ўсё іх падарожжа, поўнае рэальных небяспек, мяжуе з гульнёй: глядач да апошняга вырашае, ці то гэта наяве, ці то ў дзіцячых фантазіях, калі звыклая пясочніца раптам становіцца лодкай з красамоўнай назвай “Верабей” і плыве-ляціць насустрач прыгодам.

Але ёсць і трапныя рэальныя дэталі, што вымушаюць задумацца над тым, як дакладна дзеці капіруюць мадэль паводзін дарослых. Выпраўляючыся ў паход, Мікітка бярэ з сабой самаробны ветразь са швабры і анучы, які можа пераўтварацца ў гітару. А Насцюша цягне вялізную, памерам ледзь не больш за дзяўчынку, ёмістую сумку-заплечнік — накшталт тых, у якіх кур’еры развозяць ежу. Карцінка з натуры?

У спектаклі шмат інтэрактыву. Артысты бегаюць па зале, гулліва вітаюцца з юнымі гледачамі. Тыя, у сваю чаргу, дапамагаюць ім расквітацца з дзікунамі, выпускаючы ў іх цацачныя стрэлы. Ды і самі дзікуны нагадваюць умоўныя мішэні, што круцяцца пры траплянні (мастак — Віталь Шухман). У маці ў прамым сэнсе слова смешна “адвальваюцца рукі”. Мама і тата спачатку ўвогуле даюцца ва ўспрыманні немаўляці, якога пусцілі на падлогу побач з дарослым, што стаіць ва ўвесь рост: бачны толькі вялізныя ногі і тулава да поясу. Суразмернасць з дзецьмі-лялькамі ўзнікне хіба ў фінале, дзе песенька замацуе сямейныя каштоўнасці і ў гледачоў узнікне цудоўная ідэя падарожнічаць усёй сям’ёй — захапляльна і бяспечна. Асветніцкія дэталі мараплаўства замененыя ў спектаклі на займальна выкладзеныя правілы паводзін ля вады (дарэчы, калі дзеці сушацца ля вогнішча, асветніцкая лінія магла б быць працягнутая парадамі, як весці сябе з агнём). Вынаходліва пастаўлена тэлефанаванне, калі выклікаюць “Хуткую лялечную дапамогу”. Арыгінальна пададзены скаўты — праз барабаны з ручкамі-ножкамі. Снеданне (прычым без бацькоў, што, на думку псіхолагаў, памылкова ў выхаванні) выкладзена музычнай мовай мінімалізму (кампазітар — Анжэла Дамахоўская) — з паўторным рытмам і далучэннем усё новых гукавых пластоў: пастукванняў-пагрукванняў, размоўных фраз з іх паўторамі і да т.п. Гусь і бадлівая Карова, якіх перамагаюць дзеці, вырашаны як роставыя лялькі. Кульмінацыйным успрымаецца паядынак Мікіткі ў якасці тарэадора — яшчэ і праз выкарыстанне яркай музычнай цытаты. А вось ледзь не шэкспіраўская “сцэна буры” ёй прайграе — праз няўдалы надакучлівы музычны складнік. Затое “падводнае царства” з праекцыяй на суперзавесу выглядае так прыцягальна, што ўсе парады “асцерагацца адкрытых вадаёмаў” становяцца эфемернымі. Шкада, што гэткай жа прыцягальнасці, прыгажосці няма ў іншых лялек — найперш у Дога: выява сабакі на спіне заслужанага артыста краіны Мікалая Сцешыца куды больш эстэтычная за ляльку-персанажа. Ды і само лялькаваджэнне патрабуе ўдасканальвання.

Але галоўнае — спектакль здольны ўразіць і навучыць. Дзяцей — прадбачыць наступствы сваіх учынкаў. Дарослых — пранікнуцца дзіцячым светаўспрыманнем і ўцяміць, што кожная маленькая асоба патрабуе не меншай увагі, чым хатнія ды працоўныя клопаты.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Наталлі РОСІНАВАЙ

Сустрэчы славянскіх тэатраў

16—21 мая Гомель зноў стане месцам “Славянскіх тэатральных сустрэч”: пад такой сімвалічнай назвай тут пройдзе юбілейны, XV Міжнародны фестываль тэатральнага мастацтва.

Яго праграму складаюць 10 спектакляў з Беларусі і Расіі. Арганізатарамі традыцыйна выступаюць Міністэрства культуры нашай краіны, Гомельскі аблвыканкам і ўласна Гомельскі абласны драмтэатр, на сцэне якога пройдзе большасць паказаў. Дарэчы, Гомельшчына прадстаўлена ўсімі чатырма дзяржаўнымі тэатрамі: акрамя згаданага драматычнага, гэта гарадскі маладзёжны тэатр, славуты сваімі эксперыментальнымі пастаноўкамі, абласны тэатр лялек са спектаклем “Сакрамант лесу” па казках Якуба Коласа і Мазырскі драмтэатр імя Івана Мележа, што прывязе “Дзіўных людзей”, дзе з’яднаныя тры чэхаўскія п’есы.

Не забыта і беларуская драматургія: п’есу “6 раніцы, амерыкана” Улады Альхоўскай пакажа Разанскі абласны тэатр драмы. Мінчукі маглі бачыць аднайменную пастаноўку Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра — цікава будзе параўнаць, бо творы нашай сучаснай пісьменніцы і драматурга запатрабаваныя ў некалькіх славянскіх краінах.

З нецярплівасцю чакаецца прыезд даўніх сябраў фестывалю — Смаленскага і Бранскага тэатраў. Екацярынбургскі калектыў “ТУТ” (яго поўная назва — “Тэкст. Урал. Тэатр”) завітае з монаспектаклем “Гарбатая” Ярославы Пуліновіч, які два гады таму стаў сапраўдным адкрыццём фестывалю “Паўночныя сустрэчы” ў Ніжнявартаўску.

Вынікі падвядзе журы на чале з народным артыстам Беларусі, рэжысёрам, нязменным мастацкім кіраўніком Тэатра-студыі кінаакцёра Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм” Аляксандрам Яфрэмавым. Сярод чальцоў журы — заслужаная артыстка Расіі, артыстка і рэжысёр Вераніка Казаравіцкая, прафесар ГІТІСа Вячаслаў Кручкоў, народная артыстка Беларусі, знаная гомельская актрыса Людміла Корхава. Пераможцы будуць выяўлены ў васьмі намінацыях — ад найлепшага спектакля да асобных акцёрскіх работ, прадугледжаны і спецыяльныя прызы журы.

Адкрыецца свята вулічным тэатралізаваным дывертысментам — і пачнуцца конкурсна-фестывальныя прагляды.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Духоўнасць пад знакам любові

Сярод шматлікіх велікодных канцэртаў вылучалася творчая вечарына Віктара Лыскаўца “На крылах музыкі, паэзіі, кахання”, што сабрала аншлаг у Рэспубліканскім палацы культуры ветэранаў.

Публіка была не толькі “ветэранскага” ўзросту: моладзь вітала творы аўтара гэтак жа горача і заўзята. Лаўрэат міжнародных конкурсаў, стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі Віктар Лыскавец ладзіць падобныя канцэрты сваёй музыкі не ўпершыню. Яны праходзілі і ў сталічнай ДМШМ №1, дзе ён вядзе клас цымбалаў, і ў Мінскай абласной бібліятэцы імя А. Пушкіна, і на іншых пляцоўках.

Адметнасцю вечарын заўжды з’яўляецца сінтэз мастацтваў. Тут гучаць вершы (бо музыкант супрацоўнічае з многімі паэтамі, ствараючы не толькі песні і рамансы на іх словы, але і суцэльныя музычна-літаратурныя кампазіцыі). Выкарыстоўваюцца магчымасці відэа. Агульная карцінка часцяком дапаўняецца харэаграфіяй, прычым як асобнымі танцавальнымі нумарамі з музыкай аўтара, так і ўкрапваннем пластычных фрагментаў у вакальныя нумары. Звяртаецца Віктар і да прыёмаў інструментальнага тэатра, што стала адной з найноўшых фішак сучаснага музычнага выканальніцтва. Вось і на гэтым канцэрце: “Рукадзельніцы” для цымбальнага дуэта і фартэпіяна выконваліся ў народных строях, у час ігры дзяўчаты-салісткі па чарзе імітавалі рухі майстрых-вышывальніц, працягвалі праз струны яркія стужачкі, а ў фінале разгорвалі на цымбалах, бы на стале, вышытыя ручнікі і ўзнімалі іх угору, як у карагодзе “Ручаёк”.

Гучала шмат духоўнай музыкі (вакальнай, харавой, у тым ліку пад кіраўніцтвам жонкі кампазітара Ганны Лыскавец). Творы, прысвечаныя Анастасіі Слуцкай, Еўфрасінні Полацкай. Натхнёныя вершы (асабліва запомніліся вобразныя радкі Лізаветы Паляес). Удзельнічалі ў канцэрце і царкоўныя калектывы, і знаныя прафесійныя музыканты. Некаторыя выступілі ў новых амплуа: за раялем апыналіся і аўтар, цымбаліст па адукацыі, і Сяргей Гладкі — баяніст, акардэаніст, выкладчык і дырыжор двух аркестраў Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М. Глінкі. А над усім лунала вера і любоў — найперш да роднай Беларусі.

Надзея БУНЦЭВІЧ

СТУЖКА ЖЫЦЦЯ

АЎТОГРАФ З БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ

Сяргей Заранка

1818 — 1871

Мастак і педагог беларускага паходжання

Мастак стварыў каля 100 партрэтаў, большасць якіх былі напісаны па замовах дваранскіх асоб. Сёння работы захоўваюцца ў музеях Расіі, Беларусі ды прыватных калекцыях.

У апошнія гады жыцця рэалістычны стыль мастака трапіў у апалу. Вырасла новае пакаленне творцаў, а разам з ім і новая эстэтыка крытычнага рэалізму. Заранку абвінавачвалі ў празмернай тэхнічнасці і натуралістычнасці, рамесным падыходзе да жывапісу. Замоў значна паменшала, і мастак памёр, пакінуўшы сям’ю ў складаным матэрыяльным становішчы.

Сяргей Заранка вылучаўся не толькі як таленавіты жывапісец, але і як педагог. Ён распрацаваў асабістую методыку выкладання, якую пазней яго вучні называлі “школай Заранкі”. Многія яго навучэнцы – жанрысты і партрэтысты – сталі выбітнымі мастакамі. Сярод іх У. Макоўскі, В. Пяроў, В. Пукіраў, Л. Саламаткін і інш. Таксама ў яго навучаліся землякі – Міхал Эльвіра Андрыёлі, Вікенцій Слядзінскі.

1818 г.

Нарадзіўся 6 верасня ў мястэчку Лядыы Бабінавіцкага павета Магілёўскай губерні (цяпер — Дубровенскі раён Віцебскай вобласці) у шматдзетнай сям’і прыгоннага селяніна.

Аляксей Венецыянаў

1830 — 1840 гг.

Падчас навучання ў гімназіі здольнасці хлапчука прыкмячае акадэмік Аляксей Венецыянаў, які дапамагае юнаму таленту ўладкавацца ў рысавальны клас Акадэміі мастацтваў.

Сям’я будучага мастака належала буйному памешчыку князю Любамірскаму. У сярэдзіне 1820-х яны атрымалі вольную і перабраліся ў Пецярбург. Там бацька будучага мастака паступіў на службу да князя А.М. Галіцына, які дапамог уладкаваць маленькага Сяргея ўТрэцюю Пяцербургскую гімназію

Мастацкія здольнасці выявіліся ў хлопчыка рана. Ёсць меркаванне, што азы малявання ён асвоіў ці то ў вёсцы Сафронава Вышневалоцкага павета, ці то ў нейкага самадзейнага мастака — дыякана Траецкага падвор’я.

У гэты час памірае маці будучага мастака. Бацька хлопчыка, спяшаючыся ўладкаваць сваё жыццё з новай жонкай, выязджае на Смаленшчыну і пакідае на 15-гадовага Сяргея васьмярых братоў і сясцёр. На плечы таленавітага юнака кладзецца цяжар клопату і матэрыяльнага забеспячэння сям’і, гэты крыж ён будзе несці цягам усяго жыцця. У спробах зарабіць грошай мастак кідае гімназію, але не занятк і жывапісам у акадэміі. Талент юнака звяртае на сябе ўвагу: за карціну “Зала вучылішча правазнаўства з групамі настаўнікаў і выхаванцаў” ён атрымлівае срэбраны медаль. Сучаснікі адзначаюць яго бліскучае валоданне перспектывай, бездакорнае адлюстраванне святла і дэталяў.

“Зала вучылішча правазнаўства з групамі настаўнікаў і выхаванцаў”, 1840—1841 гг. Дзяржаўны рускі музей

1840-я

Мастак перабіраецца ў Маскву, дзе працягвае працаваць у жанры інтэр’ернага жывапісу, піша іконы па замовах цэркваў. Неўзабаве атрымлівае званне акадэміка, выкладае маляванне ў Александрыйскім інстытуце для сірот і архітэктурным вучылішчы.

Пішучы інтэр’еры, мастак часта бярэцца за буйныя, дэталізаваныя палотны, што дрэнна адбіваецца на здароўі яго вачэй. Пасля сканчэння карціны “Унутраны выгляд марскога Нікольскага сабора “Заранка страчвае зрок. Адно вока так болей і не адновіцца. Творца вяртаецца ў Пецярбург, дзе ўсур’ёз пачынае займацца партрэтным жывапісам. У 1849 годзе ён прадстаўляе публіцы партрэты генерала Пятра Ламноўскага і спевака Восіпа Пятрова. Карціны мелі ашаламляльны поспех, і з гэтага часу мастак атрымаў шырокую вядомасць у сталічным грамадстве.

“Партрэт сям’і Турчанінавых”, 1848 г., Дзяржаўная Траццякоўская галерэя

1850-я

Перыяд найбольшага росквіту творчасці мастака. Заранка атрымлівае званне прафесара гістарычнага жывапісу акадэміі і стварае найлепшыя партрэты. Тым не менш яго фінансавае становішча па-ранейшаму застаецца складаным, і ў 1856 годзе ён вяртаецца ў Маскву, дзе яму прапанавалі пасаду прафесара ў вучылішчы жывапісу і скульптуры.

У гэты перыяд мастак нарэшце ўладкоўвае жыццё сваіх братоў і сясцёр і бярэ шлюб з Ганнай Разарэнавай. У іх сям’і нараджаецца трое дзетак, аднак матэрыяльныя праблемы нікуды не сыходзяць, бо пасля жаніцьбы мастак даглядае збяднелых сваякоў жонкі.

1860-я

Пагалоска пра талент мастака і яго неверагодную, амаль фатаграфічную рэалістычнасць адлюстравання людзей неўзабаве даходзіць да імператарскага двара. У 1865 годзе творцу запрашаюць у Пецярбург, каб стварыць партрэты імператарскай сям’і для Эрмітажа. Мастак працуе над гэтай замовай цягам пяці гадоў.

“Партрэт цэсарэвіча Аляксандра Аляксандравіча (1845—1894) у свіцкім сурдуце”, 1867 г. Дзяржаўны мастацка-архітэктурны палацава-паркавы музей-запаведнік “Царскае Сяло”, Пушкін.

1871 г.

1 студзеня ў Маскве мастак раптоўна памірае ад разрыву сэрца ва ўзросце 52 гадоў. Пахаваны на могілках Аляксееўскага манастыра.

“Дзяўчынка ў блакітным”, 1870 г. Апошні партрэт, створаны мастаком. На ім ён адлюстраваў сваю дзевяцігадовую дачку Наталлю, якая ў будучым стане тэатральнай актрысай. Гэты партрэт стаў першым творам мастака ў Траццякоўскай галерэі.

НАЙВАЖНЕЙШАЕ СВЯТА

Адно з найбольш шанаваных свят краіна адзначыла на гэтым тыдні. Да Дня Перамогі ўстановы культуры падрыхтаваліся самым сур'ёзным чынам.

Падольская сельская бібліятэка-клуб сумесна з мясцовай школай правяла ўрок гісторыі "Подзвіг вялікі і вечны". Падчас мерапрыемства арганізатары звярнуліся да ваенных падзей, якія разгортваліся на Астравеччыне, згадалі тамтэйшых ветэранаў, якія зрабілі вялікі ўнёсак у Перамогу. Паглыбленню ведаў пра ліхалецце спрыяла створаная бібліятэкарамі адмысловая выстава літаратуры.

Супрацоўнікі **Мальскай сельскай бібліятэкі** зладзілі мерапрыемства "Ад пачатку вайны да Парада Перамогі" для выхаванцаў дзіцячага садка. Малыя дазналіся пра суровыя баявыя будні, пра гераізм беларускага народа. Пра гэтыя імпрэзы паведаміла **Вольга Заянчкоўская**, бібліятэкар Астравецкай раённай бібліятэкі.

Вечарына памяці "Праз полымя вайны" з удзелам навучэнцаў сярэдніх школ адбылася ў **гарадской бібліятэцы Ашмянаў**. Як піша загадчык установы **Людміла Зарэцкая**, прысутныя з цікавасцю знаёміліся з фотаздымкамі, дакументамі 1944 года, слухалі дзіцячыя ўспаміны Аліны Уладзіміраўны Пыжык, у тым ліку пра яе маці Феню Васільеўну Парфяновіч, ветэрана Вялікай Айчыннай. Дапоўніла мерапрыемства кніжная выстава і агляд літаратуры "Памяць аб вайне нам кніга пакідае".

У **Цэнтральнай гарадской бібліятэцы Жодзіна** правялі размову пакаленняў "Ля вечнага агню". Яе ўдзельнікамі былі дзеці вайны і дзеці мірнага часу.

Да Дня Перамогі ў **Краснапольскім раённым Цэнтры культуры** прайшла прэм'ера пастаноўкі "Памяць сэрца". Артыст народнага тэатра Іван Ткачоў прэзентаваў монаспектакль "Каб памяталі..." на аснове вершаў "Абеліскі" Ніны Загорскай і "Буйніцкае поле" Аляксея Пысіна. Дзіцячая тэатральная студыя "Нашы галасы" дэбютавала пластычнай візуалізацыяй "Дзеці вайны: выкрадзенае шчасце". Пастаноўка заснавана на гісторыях хлопчыкаў і дзяўчынак, якія перажылі ўсе жахі вайны. Інфармацыяй падзяліліся **Святлана Сазонава**, метадыст Цэнтралізаванай клубнай сістэмы.

Вера НІКАЛАЕВА

Чаму людзі ходзяць у тэатр?

Пра магчымую смерць тэатра кажуць даўно. Яго патэнцыйнае "забойства" прыпісваюць то тэлебачанню, то інтэрнэту або проста заяўляюць, што сцэнічнае мастацтва архаічнае і даўно сябе вычарпала. Некаторыя вераць у гэтыя сцвярджэнні, уяўляючы на падмостках класічныя маналогі і пыльны заднік. Але што скажуць людзі, якія наведваюць храм Мельпамены? З якой прычыны яны купляюць білеты?

ЮЛІЯ, радыёвядучая:

— Сёння многае абясцэньваецца, у тым ліку і тэатр, а на яго месца прыходзяць новыя тэхналогіі. Аднак жывую ігру акцёраў, іх эмоцыі і хваляванне на сцэне не заменіць нішто. Мне вельмі падабаецца глядзець спектаклі, але, на жаль, не магу наведваць храм Мельпамены часта. Драматургія — цалкам унікальнае мастацтва, якое ўзрушвае людзей і дазваляе адчуць сябе часткай творчай дзеі. Ні для каго не сакрэт: у Беларусі ёсць мноства дзівосных тэатраў, што, як правіла, з'яўляюцца славутасцямі і прыцягваюць багата гледачоў. Думаю, мы павінны берагчы і развіваць айчынную драматургію, яна займае адмысловую нішу ў мастацтве. Аднак павышэнне кошту білетаў можа стаць сур'ёзнай перашкодай для тых, хто хоча пазнаёміцца з новымі спектаклямі. Зразумела, нельга забывацца і на тое, што тэатр павінен зарабляць на сябе, але рост цэн мусіць быць апраўданым.

АЛЯКСЕЙ, харэограф:

— Людзі ходзяць у храм Мельпамены ў асноўным дзеля таго, каб атрымаць асалоду ад жывых выступленняў акцёраў. Але матывы ў гледачоў бываюць розныя. Для мяне перш за ўсё тэатр — месца, дзе ты можаш аддацца сваім эмоцыям, пачуццям. Праз занятасць даводзіцца наведваць яго, на жаль, не так часта, як хацелася б. Але стараюся не прапускаць цікавых прэм'ер — іх, на шчасце, у нашым горадзе дастаткова шмат. Сваіх дзяцей таксама далучаю да мастацтва, пакуль праз цудоўныя лялечныя пастаноўкі. Павышэнне кошту квітка, хутчэй за ўсё, паўплывае на колькасць гледачоў, бо можа іх адштурхнуць. Але тыя, каму сапраўды падабаецца тэатр, будуць гатовыя заплаціць любую цану.

АНАСТАСІЯ, фітнес-трэнер:

— Асабліва не змагу бліснуць ведамі пра тэатр. Для мяне гэта культурная ўстанова, дзе можна паглядзець выступленні таленавітых артыстаў, якія на сцэне падаюць усё майстэрства, пачуцці, харызму. Разам з рэжысёрам акцёры робяць пастаноўкі па легендарных кнігах, і ў творцаў тое выдатна атрымліваецца. Сама ж хаджу ў храмы Мельпамены рэдка, у асноўным калі хтосьці з родных прыносіць квіткі. Больш падабаюцца спектаклі на сучасныя тэмы. А так увогуле кінатэатры прыцягваюць мяне мацней. Моладзь проста не гатовая плаціць вялікія грошы, калі ёсць мноства іншых культурных мерапрыемстваў, якія каштуюць менш або даступныя зусім бясплатна.

ФІЛІП, праграміст:

— Тэатр наведваюць менавіта для культурнага адпачынку. Там можна пасмяяцца, пасмуткаваць, паглыбіцца ў тое, што хочуць перадаць акцёры, у сэнс, які аўтар уклаў у пастаноўку. Веру: людзям патрэбныя нават не гісторыі — іх нескладана знайсці ў інтэрнэце, — а вера ў лепшае, у тое, што ў нашым жыцці ёсць прыгожыя і правільныя рэчы. Мастацтва дазваляе ўбачыць і адчуць гэта. Артысты працуюць, развіваючы свае здольнасці, прысвячаючы сябе творчасці, і няхай крышачку, але набліжаюць свет да ідэалу.

Мае словы могуць здацца пафаснымі, але калі глядзіш балет ці слухаеш оперу, то атрымліваеш эмацыйны зарад і сапраўды пачынаеш верыць у нейкую дасканалую рэчаіснасць, лічыш яе рэальнай. Тэатр таксама дорыць людзям натхненне, здольнае распаўсюдзіцца на ўсе сферы жыцця — працу, творчасць, нават на жаданне ўладкаваць прастору вакол сябе.

Ганна САКАЛОВА

Выпісвайце "Культуру" і "Мастацтва" на паўгода!

Газета "Культура"

Індывідуальны льготны **63872** Шэсць месяцаў – 75,87 руб.

Ведамасны льготны **638722** Шэсць месяцаў – 125,67 руб.

зніжка да 15 %

Часопіс "Мастацтва"

Індывідуальны льготны **74941** Шэсць месяцаў – 101,20 руб.

Ведамасны льготны **749412** Шэсць месяцаў – 198,04 руб.

Пераможцаў радыёконкурсу "Маладыя таленты Беларусі" назавуць у канцы мая.

Буслы над мурамі

Этнавандроўка ўздоўж замкавых сцен

У апошні дзень красавіка скіраваліся паглядзець, як перазімавалі нашы замкі. Паехалі ўчацвярых: я, мае сыны ды нявестка. Кошка засталася на гаспадарцы. Урэшце, падарожніка хтосьці ж ды павінен чакаць дома.

Выязджалі з Мінска — сонейка прыпякала. Але дзесьці ля Іўя наўкола захмарылася, пахаладала. Пайшоў дождж. Абяцаных прагнозам залеў не было, аднак вясновы дзень нечакана стаў падобным да восеньскага.

ПАД БЕЛЫМІ КРЫЛАМІ

Гэтая вандроўка ў пэўнай ступені мела заалагічную падтрымку. Па-першае, буслы луналі ў небе і парамі рабілі штосьці важнае ў гнёздах. Па-другое, з навакольных вадаёмаў нас віталі вясёлыя карасі ды акуні, якім не псавалі настрой нават шматлікія рыбакі. (Мае сыны — адчайныя аматары пахадзіць па беразе са спінінгам — страшэнна шкадавалі, што ўсе рыбалоўныя прылады засталіся ў Мінску. Інакш бы водныя насельнікі так не радаваліся.) Патрэцяе, у вёсцы Бенін абапал шашы нахабы бабры ўсе дрэвы павалілі. Вось хто пастаянна перабудоўваецца...

Гэтая неўтаймоўная фаўна істотна ажывіла нашы доследы. Але асноўнай мэтай аўтаважу пад белымі крыламі заставаліся пашанотныя замкавыя рэшткі ды адраджэнні.

КУПАЛЫ – ДЛЯ НЯБЁСАЎ

Перад Любчай паспрачаліся. Я: "Праз дождж турыстаў не сустрэнем". Моладзь: "Дождж для цікаўных не перашкода..." Дзеці заўжды разумнейшыя за бацькоў. Інакш які сэнс? Ля кожнага без выключэння замка бесперапынна паркаваліся легкавікі з усіх беларускіх абласцей...

У любчанскія ўладанні Кішкаў і Радзівілаў прывяла брукаванка на вуліцы Савецкай. Эклектыка! Летась на даху аднаго са збудаванняў працавалі валанцёры. За год зроблена шмат. Свайго часу ў замкавым двары чакае купал, які, па словах гісторыка і музейшчыка Міколы Гайбы, будзе ўсталяваны на трэцяй вежы над нетаропкім Нёманам. Ужо хутка адчуе, што такое лунаць у нябёсах. Купалы як птушкі...

Дарэчы, мясцовы знакаміты цмок, як мы ні клікалі, не адгукнуўся: быў не ў гуморы. У змеяў таксама здараецца элегічны настрой. А вуліца Савецкая, як паведаміў Мікола Гайба, раней называлася Капыльскай.

У ПЯТРОЎНЫ – ЛЕПШ

Я б не адважыўся сказаць, што Навагрудак сёння — горад-музей. Тлумачу. Завіталі на абед у кавярню "Гараж". Нас не чакалі. Паколькі мы не адчулі ні гасціннасці, ні павагі, скіраваліся да кафэ "У Пятроўны". Як родных сустрэла нас Зінаіда Пятроўна. Усё атрымалася па-хатняму, танна і смачна. Гэта не рэклама, а журналісцкая перасцярога і парада тым турыстам, хто не жадае сапсаваць настрой кепскім сэрвісам.

Дзякаваць богу, і наступнае знаёмства аказалася прыемным. Ля Замкавай гары былы работнік сферы культуры Галіна прадавала сувеніры ад мясцовай крамы. Размаўлялі доўга... І ўсе надпісы на гасцінцах — па-беларуску... Узняліся і на гару Міндоўга. Якая ж прыгожая наша краіна!

Ад замкавых змен у мяне асаблівае ўражанне. Нібыта ў мастацкай галерэі пабываў, дзе побач з арыгіналам копія вывешана.

КРЭЎНАЯ ПОВЯЗЬ

Ля возера Літоўка выскачыла сонейка. У Іўі скульптурная выява Хрыста ля касцёла выглянула светла і гасцінна. Холад спаў — і кругом зноў забуяла вясна.

Да Гальшанаў дабраліся ўвечары. Замкавую вежу для наведванняў ужо закрылі. Шматлікія госці насалоджваліся наваколлем. Іх віталі буслы. За зімовы час з'явілася паветка над фасадам. Штосьці аднавілі, штосьці закансервавалі.

Усё робіцца для захавання сівых мураў і ў Крэве. У першы раз мы тут былі гадоў трыццаць таму. З таго часу наведвалі мястэчка ледзь не штогод. Нават пра трывалую крэўную повязь можна сцвярджаць. Маладыя ўзняліся на Юраву гару, купілі потым гліняныя сувеніры.

Захад сонца сустрэлі ў дарозе на Мінск. Кошка ледзь не паваліла.

Яўген РАГІН
Фота аўтара

Гальшанскі замак

Купал на трэцюю любчанскую вежу

Крэва

Беларусь займае восьмае месца ў рэйтынгу міжнароднага посткросінгу.

Глыбінная філасофія кімано

Захварэць на... Японію

У рамках сумеснай выставы Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў і галерэі FARBA праходзіць шэраг лекцый, прысвечаных японскай культуры. Поўныя залы і захапленне ў вачах наведвальнікаў пацвярджаюць: цікавасць да Усходу не сціхае як з боку прафесійнай суполкі, так і з боку аматараў. Ну а пакуль мінчане атрымліваюць асалоду ад гравюр укіё, мы сустрэліся з лектарам выставачнага праекта "Сны аб Японіі" мастацтвазнаўцам-японістам Ірынай Лампэ, каб пагаварыць пра сінтэз японскага і беларускага мастацтва, пра важнасць падтрымкі айчыннай культуры і, вядома, пра анімэ.

— З чаго пачалася ваша любоў да японскай культуры?

— У 12 гадоў я пазнаёмілася з кнігай класічнай японскай прозы, куды ўваходзяць некалькі твораў, адзін з якіх знакамітыя "Нататкі ля ўзгалоўя" Сэй-сёнагон. Аднак сказаць, што я захварэла Японіяй з літаратуры, не зусім дакладна, бо да гэтага я ўжо глядзела анімэ. Хутчэй, проза ўзмацніла цікавасць да Усходу і дазволіла зразумець, што гэта куды больш глыбокі культурны пласт, чым уяўляецца збоку. Прадбачу пытанне пра любімае анімэ, таму адкажу адразу: я прыхільнік класічнай японскай традыцыі і люблю "Аповесць пра Гэндзі". Лічу, што яго павінен паглядзець кожны, хто нейкім чынам звязаны з Японіяй. Таксама рэкамендую тым, хто толькі пачынае знаёмства з японскай культурай.

— Што яшчэ вы б парэкамендавалі людзям, якія цікавяцца Японіяй?

— У першую чаргу класічную прозу: "Ісэ манагатары" ("Аповесць пра Ісэ"), "Аповесць пра дом Тайра" — і паэзію. Пачынаць раю з Басё, таму што японскую паэзію складана ўспрымаць праз розніцу ў сістэме паэтычных вобразаў. Пасля гэтага можна чытаць працы Аляксандра Мешчаракова, Яўгена Штэйнэра, Наталлю Мікалаеву, і, безумоўна, заснавальніка савецкай японістыкі Мікалая Конрада.

— Дзякуючы сёлетняй выставе "Сны аб Японіі" ў нас ёсць магчымасць атрымаць задавальненне ад твораў японскага мастацтва. А дзе яшчэ можна дакрануцца да Краіны Узыходнага сонца?

— У Нацыянальным мастацкім музеі знаходзіцца Усходняя калекцыя, якая аб'ядноўвае вялікую колькасць менавіта японскіх прадметаў. Рэдка які музей можа пахваліцца тым, што ёсць у іх: тэгі і выдатныя нэцкэ, веера, уцікакэ. Прадстаўлены таксама даволі цікавыя кімано, але я экспазіцыю аднавіла б. Зразумела, што прастора ў памяшканні абмежаваная, таму выстаўлены найбольш яркія касцюмы, аднак, на мой погляд, японскае мастацтва не пра яркасць, а больш пра стрыманасць.

— Што яшчэ адрознівае японскае мастацтва?

— Яно сінэргетычнае. У еўрапейскім мастацтве мы можам вывучаць пейзаж або нацюрморт, а да ўсяго астатняга не дакранацца. У японскім мастацтве, як толькі мы пачынаем вывучаць тое ж кімано, да яго дадаецца батаніка, бо мы павінны ведаць, калі зацвітаюць пэўныя расліны: ад гэтага залежыць арнаментацыя, гама колераў, шоўк і самі матывы на кімано. Мы павінны ведаць літаратуру, пажадана не толькі японскую, але і кітайскую, таму што часам на касцюме з'яўляюцца літаратурныя сюжэты. Неабходна ведаць колеравую палітру, прынцыпы пабудовы якой ў корані адрозніваюцца ад той, якой карыстаюцца еўрапейскія мастакі. Адназначна неабходна ведаць ткацтва, арыентавацца ў пляценні, разбірацца ў гісторыі касцюма...

— Пагаворым крыху пра кімано. Наколькі я ведаю, у вас самая вялікая калекцыя традыцыйнага японскага адзення ў нашай краіне. Якія нюансы ў такога хобі?

— Сёння сабраць калекцыю кімано магчыма, але, як я ўжо згадала, трэба адначасова разбірацца ў многіх рэчах. Па-першае, правільна складаць і захоўваць кімано. Па-другое, падбіраць і насіць яго. Асобным подзвігам я лічу (ды і самі японцы лічаць, бо гэта нялёгкая справа), калі вы самі можаце надзець кімано і завязаць пояс обі. У японскай культуры існуе прынцып "па адзенні сустракаюць", да таго ж ён узведзены ў n-ную ступень важнасці. Раней, калі чалавек апранаў пэўны колер, атачэнне ўжо разумела, адкуль гэты чалавек, чым дыхае, якому саслоўю належыць. Сёння па тым, як падабраны традыцыйны касцюм, японец можа "прачытаць", прафесіянал вы ці не. Менавіта таму вялікую ролю адыгрывае класіфікацыя кімано: вы павінны разумець, што апранаеце. Класіфікацый існуе шмат, яны кожны раз удакладняюцца, і сёлета на канферэнцыі факультэта міжнародных адносін БДУ я прадстаўлю сваю адноўленую класіфікацыю кімано.

— Якое месца традыцыйны японскі касцюм займае ў жыцці сучаснага японца?

— Кімано заўсёды адыгрывала важную ролю. Нават пасля Другой сусветнай вайны, калі на краіну моцна ўплывала амерыканская культура, кімано не губляла сваёй значнасці. Кімано — гэта як ханамі, як сінтаізм, — тое, без чаго японцы не будуць японцамі. У Японіі і да гэтага часу захоўваецца традыцыя апранаць традыцыйны касцюм на значныя для японца падзеі: вяселле, Свята дзяўчынак, Свята хлопчыкаў, розныя фестывалі і, зразумела, цырымонія паўналецця.

Фестываль гарбаты

Нэцкэ —
мініяцюрная скульптура, твор японскага дэкаратыўна прыкладнога мастацтва, які ўяўляе з сябе невялікую разьбяную бірульку.

Уцікакэ —
цырыманіяльная жаночая накідка.

Обі —
японскі паяс, які носяць паверх кімано.

Ханамі —
японская нацыянальная традыцыя любавання кветкамі.

Сінтаізм —
традыцыйная політэістычная рэлігія Японіі, заснаваная на анімістычных вераваннях старажытных японцаў.

Вабі-сабі —
шырокая частка японскага светапогляду: "вабі" асацыюецца са сціпласцю, адзінотай, адсутнасцю яркасці, аднак прытым і з унутранай сілай, "сабі" звязаны з архаічнасцю, непадробнай сапраўднасцю.

Лекцыя пра кімано ў рамках выставы "Сны аб Японіі"

— Вы займаецеся даследаваннем Японіі і яе ўплывам на беларускую культуру. Ці былі ў вас нейкія нечаканыя адкрыцці?

— Калі я пачала збіраць матэрыял для кандыдацкай дысертацыі на тэму ўплыву японскай культуры на дэкаратыўна-прыкладное і выяўленчае мастацтва Беларусі ў перыяд з другой паловы XX стагоддзя да пачатку XXI, я зразумела, што карані цікавасці да Японіі досыць глыбокія ў Беларусі. Яны бяруць пачатак у канцы XVII стагоддзя, калі фармаваліся першыя магнацкія калекцыі. Зразумела, што тады не асабліва падзялялі Кітай і Японію, але, тым не менш, бліжэй да пачатку XX стагоддзя многія беларускія магнаты мелі японскія сады, а ў графаў Любанскіх быў нават пакой ва ўсходнім стылі, дзе можна было назіраць як прадметы эпохі Мэйдзі, так і больш позніх часоў, а таксама кітайскія ліхтарыкі. Захавалася фатаграфія графіні Любанскай у гэтым пакоі: з веерам, валасы ўпрыгожаны кветкамі, а сама графіня ў касцюме, які нагадвае кімано.

— Ці знайшліся яшчэ перакрыжаванні японскай і беларускай культур?

— Вы ведалі, што Максім Багдановіч рабіў цудоўныя пераклады японскіх вершаў на беларускую мову? У пачатку XX стагоддзя паэт надаваў шмат увагі розным культурам, і Японія была адным з прадметаў яго цікавасці. Наш суайчыннік Аляксандр Ларыёнаў больш за 30 гадоў прысвяціў ілюстраванню паэзіі Басё. Як мастак ён не рабіў кальку з вобразаў тых вершаў, на якія абапіраўся, але даваў уласную інтэрпрэтацыю японскіх матываў. Краявіды Валерыя Шкарубы ўтрымліваюць у сабе той самы беларускі смутак, які мае выразны аналаг у японскай культуры — вабі-сабі. Акрамя таго, нашы культуры маюць шмат агульнага на даволі глыбінных узроўнях. Напрыклад, у Беларусі, як і ў Японіі, вялікае значэнне мае культ продкаў. І беларусы, гэтак жа, як і японцы, вельмі шануюць родную прыроду і ўслаўляюць яе ў творах мастацтва.

— А ці ёсць падобны судотык культур у японскім мастацтве?

— Ёсць, і даволі нечаканы! Да Летняй алімпіяды ў Токіа ў Японіі праводзіўся праект па стварэнні кімано. Адна з дызайнераў, спадарыня Міцумі Акуна, зрабіла кімано ў беларускім стылі. Яна правяла даследаванні і ўлічыла ўсе элементы, уласцівы менавіта нашай культуры. На яе кімано былі і буслы, і нацыянальныя беларускія арнаменты, і кветкі, і нават вянкі, якія з'яўляюцца сімвалам Купалля.

— Калі ўжо мы закранулі прадстаўленне Беларусі на міжнародным арэне, што, на ваш погляд, можа паспрыяць прасоўванню нашай краіны?

— Безумоўна культура, бо гэта тая сфера, якая пашырае ўсе астатнія. Нам ёсць чым ганарыцца, беларуская культура самабытная, яна захоўвае нашу ідэнтычнасць і мы не павінны дапусціць яе знікнення. Таму мае сэнс падтрымліваць вядомыя беларускія брэнды, распаўсюджваць інфармацыю аб нашых славутасцях, аб беларускай нацыянальнай кухні. І, што асабліва важна, вярнуць на радзіму тыя шэдэўры, якія гуляюць па свеце, каб нашы людзі насычаліся сваёй, беларускай энергетыкай, станавіліся мацнейшымі і не гублялі свой менталітэт.

— Японская культура, да прыкладу, стварыла імідж для ўсёй краіны. Што нам можна запазычыць з Усходу?

— Падыход у сферы кіно, у прыватнасці анімэ. Калі чалавек ходзіць па тым жа Кіёта або Токіа і заўважае рэальныя японскія месцы і краявіды, якія мастакі паказваюць у анімэ, у яго ўзнікаюць фантастычныя адчуванні. Цікава было б у беларускай анімацыі на падобныя рэчы паглядзець. Ну і было б выдатна мець менавіта іграўвыя фільмы пра нашых знакамітых мастакоў, выдатных дзяржаўных дзеячаў, каб папулярызаваць культуру.

Яўгенія ГАБЕЦ

У Беларусі, як і ў Японіі, вялікае значэнне мае культ продкаў. І беларусы, гэтак жа, як і японцы, вельмі шануюць родную прыроду і ўслаўляюць яе ў творах мастацтва.

Кімано, якое прадстаўляла Беларусь на Kimono Project у рамках Алімпійскіх гульняў у Токіа

Са студэнтамі кафедры ўсходніх моў БДУ

"Сярэдзіна лета", Ян Люцзін

Гармонія, якая сцірае межы

У Мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" адкрылася выстава жывапісу магістранткі БДУКМ з Кітайскай Народнай Рэспублікі Ян Люцзін "Вобразы Кітая". У экспазіцыі прадстаўлены работы, выкананыя ў класічным кітайскім стылі гохуа.

Займаецца жывапісам Ян Люцзін ужо дзевяць гадоў. Засвоіла асновы мастацтва дома, а ў Беларусі паступіла ў магістратуру. Выбар краіны не быў выпадковым: тут жыве сваяк мастачкі, які парэкамендаваў прыехаць на вучобу менавіта ў Мінск. Калекцыя, прадстаўленая сёння, была створана Ян Люцзін пасля прыезду ў Беларусь, калі дзяўчына пачала моцна сумаваць па радзіме: "Мне вельмі хацелася перадаць сваю любоў і тугу па Кітаі, яго вытанчаных пейзажах, а таксама паказаць беларускаму гледачу спецыфіку кітайскай культуры. Я спадзяюся, што наведвальнікі змогуць адчуць тыя матывы і вобразы, якія я імкнулася адлюстраваць у сваіх карцінах". У працах мастачкі адчуваецца нябачная прысутнасць духоўнасці і ўнутранай гармоніі. Дадатковую глыбіню і сімвалізм мінімалістычным кітайскім пейзажам надаюць тонка падабраныя адценні колераў, кампазіцыя, а таксама авеяныя ўсходняй філасофіяй назвы.

"Я адчуваю гонар за нашу студэнтку, якая ў сваіх працах адлюстроўвае эмоцыі, перажытыя тут, і веды, атрыманыя не толькі ў сябе на радзіме, але і ў нашым універсітэце, — кажа куратар мастачкі, магістр культуралогіі **Вольга Вярбіцкая**. — Хочацца падзякаваць Ян Люцзін, бо яна стварае магчымасць дыялогу паміж нашымі культурамі і спрыяе іх узаемаўзбагачэнню. Сёння мы гаворым на адной мове — мове мастацтва".

Свае карціны Ян Люцзін піша ў спакойнай абстаноўцы, у адзіноце. Менавіта такая атмасфера дапамагае настроіцца на больш цесны кантакт з інструментамі, якія яна выкарыстоўвае ў працы. "Звычайна я пішу дома, таму што для стварэння карцін у дадзеным стылі неабходныя спецыяльныя інструменты, якія нязручна размяшчаць у іншым месцы", — дзеліцца мастачка. Сёння сярод яе работ — класічныя кітайскія пейзажы, кветкі і птушкі. Аднак Ян Люцзін прызнаецца, што ў хуткім часе плануе напісаць і Беларусь: "Мне вельмі спадабаліся Мінскі чыгуначны вакзал і беларускія храмы. Хацелася б намаляваць менавіта гэтыя архітэктурныя будынкі".

Выстава "Вобразы Кітая" працягнецца да 23 мая.

Яўгенія ГАБЕЦ

Асвятленне ў зале Драздовіча нагадвае зорнае неба

Дываны Алены Кіш дапоўненыя скульптурнымі працамі Уладзіміра Ламейкі

Залаты леў інсітнага раю

Чым дакладна запомніцца сёлетні Дзень музеяў, дык гэта доўгачаканым адкрыццём экспазіцыі маляваных дываноў. У тым, што новая пляцоўка Гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Заслаўе" будзе карыстацца немалым поспехам, сумнявацца не выпадае: самабытнае народнае мастацтва цяпер у пашане. Аглядальнік "К" наведаў выставачную прастору незадоўга да пачатку яе працы і пераканаўся: хоць музей мае даволі сціплыя плошчы, раскрыць у экспазіцыі тэму ўдалося. Адпаведна, гасцей чакае шмат цікавага.

ЭРМІТАЖ У АТАЧЭННІ ЦЯПЛІЦ

Калекцыя маляванак пачала фарміравацца ў Заслаўі болей за тры дзесяцігоддзі таму — яшчэ ў тыя часіны, калі дываны мала хто ўспрымаў усур'ёз, і таму яны часцяком пыліліся ў хлявах ды на гарышчах. І паколькі супрацоўнікі музея-запаведніка Юрась Малаш, Ала Сташкевіч і Аляксандр Рак былі сярод "першаадкрывальнікаў" гэтага мастацкага феномена, у экспедыцыях іх чакаў шчодры ўлоў. Агулам у калекцыі сёння — каля 300 дываноў і макатак з розных куткоў Беларусі. Гэта непараўнальна больш, чым у любым іншым нашым фондасховішчы.

Такую шыкоўную калекцыю грэх не выстаўляць. Таму цалкам выглумачальна, што ўжо даволі даўно з'явілася ідэя стварыць на базе запаведніка асобны музей інсітнага мастацтва або хаця б тых самых маляваных дываноў. Значным стымулам да рэалізацыі задумы стаў грант фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтваў.

Як адзначыў дырэктар заслаўскага музея-запаведніка Юрый Шкурскі, праца над новым аб'ектам аказалася няпростай: даваліся ў знакі як фінансавыя ды адміністратыўныя мітрэнгі, так і розныя тэхнічныя праблемы, звязаныя з адаптацыяй пад патрэбы ўстановы зусім непрыстасаванага для экспазіцыі памяшкання.

Камянічку, што знаходзіцца на балансе музея-запаведніка гадоў дзесяць, многія ведаюць як былы дом дзіцячай творчасці. Аднак непрыкметны будынак мае куды больш даўняе і адметнае мінулае. Гэта адзіны ацалелы ў Беларусі эрмітаж — той флігель сядзібы Пшаздзецкіх, дзе паспадары адпачывалі ад будзённага тлуму ў кампаніі муз. І вось можна гаварыць, што архітэктурны помнік урэшце вярнуў сабе адпачатную функцыю. Хаця... тут ёсць пытанні.

— Цяжка сказаць, як адрэагавалі б на з'яўленне музея маляванкі самі паны Пшаздзецкія, — пасміхаецца намеснік дырэктара музея-запаведніка Ксенія Сямашка.

Гэтага мы, вядома, ніколі не даведаемся. Але ж ідэя аддаць былы панскі флігель пад дэманстрацыю такога "простанароднага" культурнага феномена, як маляванка, мела сваіх супраціўнікаў ужо і ў наш век. Маўляў, лепш стварыць тут галерэю сучаснага мастацтва ці музей гісторыі горада, а пад дываны пашукаць іншае месца. Але ўрэшце ўзяў верх рэалістычны падыход: чакаць з'яўлення больш прыдатнай пляцоўкі для экспанавання ўнікальнай калекцыі можна было яшчэ вельмі доўга.

Думаецца, ёсць тут рацыя. Пагатоў нічога панскага ў ваколіцах эрмітажа ўжо і блізка не засталося. Усутыч да музея — прыватныя падворкі з клумбамі ды цяпліцамі. Шмат зеляніны, птушкі пяюць, сабачкі часам брэшуць... Таму адчуваеш сябе недзе ў вёсцы — і гэта вельмі спрыяе "паглыбленню ў тэму".

Эрмітаж — бадай адзінае, што ацалела ад грандыёзнага сядзібнага ансамбля. Пазнейшыя рамонты ладна "асучаснілі" і гэтую камяніцу. Але побач з ёй дасюль раскашуюць лістоўніца і ліпа, што засталіся з былых часоў.

Таксама музейшчыкі маюць задуму ўсталяваць на падворку макет розных пабудоў маёнтка — каб гледачы маглі здзівіцца таму, наколькі перайначыліся навакольныя мясціны, і раскрыць для сябе прыхаваную сёння сторонку гісторыі Заслаўя.

ПАПУГАЙЧЫК "ПАД ДРАЗДОВІЧА"

Музей маляванкі складаецца з дзвюх частак — пастаяннай экспазіцыі і залы для зменных выстаў. Першая пачынаецца з сімвалічнай рэканструкцыі інтэр'ера сялянскай хаты. Апрача дывана тут — распісны куфар, тканыя посцілкі, вышытыя ручнікі... Розныя іпастасі народнага мастацтва, якія звыкла суседнічалі ў побыце, атачаючы нашых продкаў.

Карпатлівы працэс стварэння экспазіцыі

Дыван з гномікам, які грае на віяланчэлі, адметны найперш па адной прычыне: гэта адзіны ў калекцыі артэфакт родам з ваколіц Заслаўя. Чаму так здарылася? Можа, у прысталічны рэгіён хутчэй праніклі фабрычныя вырабы, якія ўрэшце паўсюдна выцеснілі дываны. А можа, даследчыкі проста не паспелі сабраць аўтэнтыку...

Лагатыпам музея стаў залаты леў Алены Кіш. У заслаўскіх фондах знаходзяцца 11 яе работ — з 13 вядомых цяпер. У пастаяннай экспазіцыі змясціліся толькі тры — па колькасці тыповых для мастачкі сюжэтаў: "Ліст да каханага", "Рай" і "Дзева на водах". А вось прасачыць варыяцыі зместу можна дзякуючы ўсталяванаму тут жа інфакіёску. Ужо сёння медыяфайлаў у яго запампавана даволі багата.

Па словах старшага навуковага супрацоўніка музея-запаведніка Генадзя Сівохіна, віртуальная частка экспазіцыі будзе несупынна пашырацца — балазе тут ужо ніякіх абмежаванняў па плошчы няма. Інфацэнтр дае магчымасці сабраць рэпрадукцыі маляванак з іншых калекцый, навуковыя публікацыі, біяграфіі мастакоў, нават фільмы пра іх...

Суседняя зала з падлогі да столі (тое — задума стваральнікаў экспазіцыі) завешана дыванамі Язэпа Драздовіча. Пабачыўшы адразу так шмат іх, можна зразумець, наколькі гэтыя творы розныя. Ёсць тут і, бадай, тагасветныя месяцовыя краявіды, якія няўлоўна нагадваюць знакамітыя "касмавізіі" (хіба што пейзажы на іх адлюстраваны пазнавальныя, беларускія). Прысутнічаюць і зусім немудрагелістыя кветачкі ды лубковыя сюжэты.

Што ні кажы, а дываны — гэта ўсё ж не чыстае мастацтва. Усе яны пісаліся на замову, і, каб зарабіць сваю пару залатовак (мізэрныя грошы для трох дзён цяжкай працы), майстар мусіў прыслухоўвацца да пажаданняў замоўцы.

Адпаведна, кожны дыван мае адмысловую гісторыю, дазнацца якую — цікавая задача для музейшчыкаў. Ксенія Сямашка распавядае пра нядаўнія адкрыцці. Раней замоўцамі адной з маляванак лічыліся сёстры Валошкі, прычым ніхто нават не ведаў, гэта сапраўднае прозвішча або пяшчотны эпітэт. Аднак калі ўдалося адшукаць унука адной з тых сёстраў, выявілася, што насамрэч яны — Балошкі. Далей росшукі прывялі ў бібліятэку, дзе захоўваюцца дзённікі Драздовіча. Там знайшлася згадка пра гэтую гасцінную для мастака хату, у якой ён часта спыняўся і якую ўрэшце ператварыў сваімі стараннямі ў сапраўдны вясковы музей.

Яшчэ адзін цікавы экспанат — дзве макаткі з папугайчыкамі. Адна з іх дакладна належыць руцэ Драздовіча, а вось іншая, мяркуючы па ўсім, стала наследаваннем майстру або нават імітацыяй.

Не ведаю, ці падрабляе хто маляванкі гэтага аўтара сёння, але — выглядае цалкам магчымым, бо каштуюць яны немалыя грошы. Калекцыя музея працягвае спакваля пашырацца: на адкрыцці спонсары павінны падараваць установе яшчэ адзін дыван Драздовіча, выкуплены за ўласныя сродкі.

Варта дадаць, што заслаўскі збор маляванак уключае не толькі самі дываны, але і працы прафесійных мастакоў, створаныя пад уплывам гэтай з'явы. Музей удала дапаўняюць скульптуры Уладзіміра Ламейкі, натхнёныя вобразамі Алены Кіш.

VR-МАЛЯВАНКА

Калі экспазіцыя ў першай зале для многіх чаканая, то ў другой, бясспрэчна, для наведвальнікаў будуць адкрыцці. Там можна пераканацца, што два выбітныя мастакі, чые імёны сёння на слыху, былі далёка не адзінымі — адначасова з майстрамі стваралі маляванкі сотні самародкаў. Той агульны кантэкст і адлюстроўвае выстава. І, як выяўляецца, ён вельмі размаіты.

— На прыкладзе гэтых распісных дываноў мы імкнёмся паказаць, як з часам мянялася стылістыка, густы, тэхналогіі, — кажа Ксенія Сямашка.

Малявалі на ўсім, што падвернецца пад руку: даматканым палатне, коўдрах, абрусах, паперы, цыраце, пакупной тканіне... Сюжэты чэрпалі адсюль, адкуль толькі можна: і з іканапісу, і з Васняцова і Шышкіна, чые рэпрадукцыі таксама пачалі трапляць у паваенную вёску (скажам, у выглядзе цукерачных абгортак). Без сумневу, маляванка была адкрытая да самых розных уплываў — як станоўчых, так і не зусім.

Аднак часам крыніцы натхнення зусім не відавочныя. Скажам, у майстра Іпаліта Ворсы заўважныя нават шагалаўскія матывы. Хаця адкуль творы жывапісца мог ведаць вясковец з Пастаўшчыны?

Некаторыя з убачаных на выставе дываноў здаюцца наіўнымі і каструбаватымі спробамі дацягнуцца да "высокай культуры". Іншыя ж пазбаўлены такіх комплексаў, таму выглядаюць куды больш цікава ды самабытна. Але ў кожным разе маляванкі прасякнуты непасрэднасцю і свежасцю ўспрымання, характэрнымі для інсітнага мастацтва.

Знаёмству з артэфактамі зусім не перашкаджае сучаснае тэхнічнае "начыненне", у якім заслаўскі музей ані не саступае сталічным. Дбайна прадуманае асвятленне дапамагае засяродзіць увагу на творах, а мабільныя перагародкі на колах у перспектыве дазволяць "гуляць з прасторай", выбудоўваючы экспазіцыю згодна з ідэяй канкрэтнай выставы.

Кампенсаваць недахоп аўтэнтычных экспанатаў сучаснымі электроннымі тэхналогіямі ў музея няма патрэбы. Аднак без моднай фішкі ён не абышоўся. Надзеўшы VR-акуляры, кожны ахвочы здолее трапіць у прастору маляванага дывана або скласці яго, быццам пазл. Несумненна, такі атракцыён будзе карыстацца асаблівым попытам сярод дзятвы, хаця і дарослыя з задавальненнем далучацца.

Яшчэ адна важная сучасная тэндэнцыя — адкрытасць музея да людзей з інваліднасцю. Ужо сёння ва ўстанове забяспечана безбар'ернае асяроддзе. Плануецца, што неўзабаве ў свеце маляванкі змогуць апынуцца людзі з парушэннямі зроку. На музейным падворку павінны з'явіцца рэльефы, якія "перакладуць" асобныя творы на тактыльную мову.

— Мы б хацелі, каб музей дываноў быў адкрыты для ўсіх, — кажа Юрый Шкурскі. — Каб ён не толькі ладзіў прыцягальныя для публікі экспазіцыі, але з часам стаў цэнтрам даследаванняў, дыскусій, майстар-класаў. Каб ён аб'ядноўваў усіх зацікаўленых гэтай тэмай. І галоўнае — каб тут заўсёды віравала жыццё.

Ілья СВІРЫН

Іпаліт Ворса, "Дзяўчына і музыкант"

Маляванка невядомага аўтара

VR (віртуальная рэальнасць) — свет, створаны тэхнічнымі сродкамі, які перадаецца чалавеку праз зрок, слых, дотык і г. д.

Першы і адзіны ў Беларусі музей, прысвечаны традыцыйнаму роспісу дываноў

Кнігі, вартыя ўвагі



"Беларускія посцілкі і дываны. Антрапалогія і мастацтва традыцыйнай рэчы"

Што? Бестселер у свеце навуковай і навукова-папулярнай літаратуры, гэтая кніга вытрымала два перавыданні, і цяпер рыхтуецца да друку трэцяе!

Чаму "антрапалогія"? Зразумець рэч па-за кантэкстам яе стварэння і існавання побач з чалавекам немагчыма: тканыя посцілкі і дываны спадарожнічалі людзям у побыце і абрадах, адлюстроўвалі ўяўленне аб прыгажосці, дый наогул прадметы народнага тэкстыльнага мастацтва — выбітная з'ява беларускай нацыянальнай культуры.

Выданне аздоблена раскошным ілюстрацыйным матэрыялам, прадстаўленым не толькі ў альбомнай частцы, але і ўсцяж кнігі; напрыканцы змешчаны слоўнік народнай тэрміналогіі, бо адпаведная лексіка, багатая і разнастайная, важная для разумення працэсаў развіцця ткацтва ў Беларусі, яго сувязей з гістарычна-сацыяльнымі ўмовамі рынкамі на працягу апошніх трох стагоддзяў.

Хто? Вольга Аляксандраўна Лабачэўская — доктар мастацтвазнаўства, прафесар Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, культуролаг, этнолаг.

Каму? Супрацоўнікам устаноў культуры і адукацыі, мастакам і дызайнерам, а таксама шырокаму колу знаўцаў і аматараў беларускай народнай творчасці.

Андрэй КРАСІЦКІ

Гэтае выданне вы можаце знайсці ў сваёй бібліятэцы, кнігарнях або замовіць на сайце "Акадэмкнігі" з дастаўкай па Беларусі.

ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ ФІЛАРМОНІЯ

г. Віцебск, вул. Леніна, 69,
тэл. касы: 8 0212 368387,
сайт: vitebsk-fil.by

• Чароўнае гучанне беларускіх цымбалаў на канцэрце **"Абуджэнне" (6+). 16 мая ў 19.00.**
• **"Песні ад сэрца да сэрца" (6+)** – вакальная група і аркестр ансамбля **"Талака"** да Года міру і стварэння. **17 мая ў 19.00.**
• Новая імпрэза цыкла лекцый-канцэртаў **"Ad Libitum"**, прысвечаная Ігару Крутому **(6+). 18 мая ў 19.00.**
• **"Рамансам сэрца абудзі" (6+)** – вечар рамансаў да 150-годдзя з дня **нараджэння Сяргея Рахманінава. 19 мая ў 19.00.**
• Прадстаўленне **"Залатое кураня" (2+)** у межах праекта **"Філармонія – дзецям". 20 мая ў 11.00.**
• Прадстаўленне **"Героі нашага часу" (3+) у межах праекта "Філармонія – дзецям".** Прэм'ера. **21 мая ў 11.00.**

УНП 300149385

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7,
тэл.: 8 017 3654237, 8 017 3576627,
пошта: kupalabilet@mail.ru

• Трагікамедыя **"Чакана гучна і да болю блізка" (16+).** Камерная сцэна. **13 мая ў 19.00.**
• Прадстаўленне **"Музыка душы" (0+).** Камінная зала. **13 мая ў 19.00.**
• Спектакль **"Трыбунал" (12+).** Галоўная сцэна. **14 мая ў 18.00.**
• Спектакль **"Пасланне з мінулага" (16+).** Трагедыя, заснаваная на рэальных падзеях, якія адбываліся ў г. Пінску. Галоўная сцэна. **16 мая ў 18.00.**
• Трагіфарс **"Donna sola (Жанчына адна)" (18+).** Камерная сцэна. **16 мая ў 19.00.**
• Пластычны спектакль у 1 дзеі **"Наш космас" (12+).** Галоўная сцэна. **17 мая ў 19.00.**
• Надзвычайна неверагоднае здарэнне ў 2 дзеях **"Жаніцьба" (12+).** Галоўная сцэна. **18 мая ў 19.00.**

УНП 100377901

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1,
тэл.: 8 017 2431041 (каса),
8 017 3615493

• Опера ў 2 дзеях **"Рыгалета" (12+). 13 мая ў 18.00.**
• Балет у 3 дзеях **"Карсар" (12+). 14 мая ў 18.00.**
• **Канцэрт-сюрпрыз (12+). 14 мая ў 18.30.**
• Опера ў 3 дзеях **"Самсон і Даліла" (12+). 16 мая ў 19.00.**
• **Гала-канцэрт да юбілею тэатра (12+). 19 мая ў 19.00.**
• Опера ў 2 дзеях **"Царская нявеста" (12+). 20 мая ў 18.00.**
• Балет у 2 дзеях **"Канёк-Гарбунок" (6+). 21 мая ў 11.00 і 18.00.**

УНП 191081322

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2,
тэл.: 8 0212 669077 (каса)

• Музычная казка ў 2 дзеях **"Церам-церамок" (3+). 13 мая ў 11.00.**
• Спектакль – музычная рэпетыцыя **"Тук-тук! Хто там?" (5+). 14 мая ў 11.00.**
• Казка-гульня ў 1 дзеі **"Калабок" (3+).** Фае тэатра. **18 мая ў 18.00.**
• Казка-прыпавесць ў 1 дзеі **"Кацёл з каменьчыкамі" (7+). 20 мая ў 11.00.**
• Зусім верагоднае здарэнне ў 2 дзеях **"Яшчэ раз пра Чырвоную Шапачку" (3+). 21 мая ў 11.00.**

УНП 300001869

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20,
тэл.: 8 017 3970163
(экскурсійнае бюро)

• **Пастаянныя экспазіцыі.**
• Выставачны праект **"Чыстае мастацтва". Да 16 мая.**
• Выставачны праект **"Вобраз Радзімы ў творах беларускіх мастакоў XVIII–XXI стст.".** Выставачны корпус, вул. К. Маркса, 24. **Да 21 мая.**
• Выставачны праект **"Віталь Канстанцінавіч Цвірка. Да 110-годдзя з дня нараджэння".** Выставачны корпус, вул. К. Маркса, 24. **Да 4 чэрвеня.**
• Выстава **"Неба і зямля Аляксандра Кішчанкі"**, прымеркаваная да 90-годдзя з дня нараджэння мастака. **Да 9 ліпеня.**
• Выстава графікі Леаніда Шчамялёва **"Нараджэнне творчасці"** са збору Нацыянальнага мастацкага музея і з калекцыі мастаковай сям'і. **Да 10 ліпеня.**
• Выстава **"Барыс Кустодзіеў"**, прымеркаваная да 145-годдзя з дня нараджэння выбітнага жывапісца, аднаго з арыгінальных майстроў рускага мастацтва канца XIX – першай чвэрці XX стагоддзя. **Да 21 мая.**
• Экскурсіі: **"Самыя-самыя..." (6+), "Якога колеру зіма?" (6+), "Віды і жанры ў выяўленчым мастацтве" (6+), "Казкі Усходу" (10+), "Міфы Старажытнай Грэцыі і Рыма" (10+), "Партрэты даўніх мінулых пакаленняў..." (10+), "Пяць моў кахання" (16+), "Жаночы партрэт" (16+), "Мінск у Музеі" (16+). Праводзяцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА 1-Й ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а,
тэл.: 8 017 3637796, 8 017 3588878

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Выстава выцінанкі Вольгі Налівайка **"Папяровыя мары".** Да 26 чэрвеня.
• Экскурсія **"Шлях мастака Валенція Ваньковіча".** Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
• Экскурсія **"Сядзібны партрэт".** **Праводзіцца заўсёды.**
• Спектакль тэатра ценяў **"Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях. Белая сарока".** Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён,
тэл.: 8 017 5074468

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Праграма **"Каляды ў музеі". Праводзіцца заўсёды.** Працягласць – 2–2,5 гадзіны. Папярэдні запіс абавязковы.

УНП 100377771

МУЗЕЙ В. К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37,
тэл.: 8 0222 650203, 8 0222 658800

• **Пастаянныя экспазіцыі.**
• Выстава **"Жаночы род". Да 28 мая.**
• Art-lectorium **"Зразумелае мастацтва". Праводзіцца заўсёды.** Падрабязней на сайце artmuseum.by альбо па тэлефонах 8 0222 650203, 8 0222 658800.

УНП 100377771

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19,
тэл.: 8 01770 20602, 8 01770 20660,
8 029 5518051, 8 029 1903149

Палацавы ансамбль
• **"Містэрыя Нясвіжскага палаца"** – культурнае мерапрыемства, прымеркаванае да міжнароднай акцыі **"Ноч музеяў-2023". 20 мая. З 19.00 да 22.00.**
• Канцэрт старажытнай беларускай музыкі **"Полацкі сшытак" Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага ансамбля "Харошкі". 20 мая ў 14.00 і 16.00. Тэатральная зала.**
• Праект **"Упершыню экспанат. З фонду Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж»"**, прысвечаны 30-годдзю ўстановы і 800-годдзю горада Нясвіжа. Вялікая выставачная зала. **Да 10 снежня.**
• Выстава **"Недзеепрыметны зварот".** Часовая экспазіцыя аўтарскіх лялек, прысвечаных пісьменнікам і паэтам XIX–XX стагоддзяў, ад сяброў Міжнароднай гільдыі майстроў (Санкт-Пецярбург). Малая выставачная зала. **Да 28 мая.**
• Выставачны праект **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны".** Экспазіцыйная зала першага пускавога комплексу.
• Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара".** У складзе пастаяннай экспазіцыі.

Мерапрыемствы
• Квэсты: **"Палацавыя таямніцы", "Музычная скарбніца Нясвіжскага палаца".**
• Віртуальныя выставы: **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны", "Нясвіж – здабытак сусветнай культуры",** экспазіцыя Паўла Татарнікава **"Магнацкія двары і замкі Беларусі".**
• Тэматычныя і аглядныя экскурсіі па гісторыка-архітэктурных помніках і ландшафтных парках Нясвіжа.

Аддзел экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1
• Часовая выстава акварэляў мастачкі Таццяны Матусевіч **"Вальс кветак". Да 5 чэрвеня.**

Ратуша (г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3)
Пастаянныя экспазіцыі
• **"Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII – 1-й палове XIX стст.".**
• **"Нясвіж у міжваенны час. Людзі і падзеі".**
• Калекцыя гадзіннікаў XIX–XX стст. **"Культура часу".** З фондаў музея-запаведніка.

Мерапрыемствы
• Квэсты: **"Безаблічны артэфакт", "Карта сямі каралеўстваў", "Музейны дэтэктыў", "Музейнае расследаванне".**
• Культурныя мерапрыемствы: **"Прыём у княгіні", "Дзень нараджэння ў Ратушы"** (група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў).
• Сюжэтна-ролевая развівальная праграма **"Школа шпіёнаў"** (група да 25 чалавек).
• Гульня-знаёмства **"Музейка аб музеі"** (група да 25 чалавек ад 4 да 7 гадоў).
• Гульнявая праграма **"Выкрунтасы"** (група да 25 чалавек).

Падрабязнасці на сайце niasvizh.by.

УНП 600207920

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г. п. Мір, Карэліцкі раён,
Гродзенская вобласць,
тэл.: 8 01596 36290,
8 01596 36270

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Квэст **"Таямніца двух куфраў". 13 мая ў 15.30.**
• **Міжнародны дзень музеяў:** тэатралізаваныя экскурсіі, старадаўнія танцы ў Партрэтнай зале, сакрэты вырабу выцінанкі на мансардзе замка, новы экспанат у экспазіцыйнай зале "Першыя ўладальнікі Міра", які непасрэдна звязаны з заснавальнікам замка Юрыем Ільінічам, конкурс "Музейнае пераўвасабленне". **18 мая з 10.00 да 18.00.**
• Часовая выстава выцінанак **"Карункавыя ўзоры Святланы Вяль" (0+). Да 28 мая.**
• Экспазіцыя **"ARMATUS. Ваенна-гістарычная рэканструкцыя даспехаў і зброі" (0+).** Паўночны корпус. **Да 31 жніўня.**
• Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.
• Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых.
• Экскурсія для дваіх **"Інтрыгі Купідона".**
• Сямейная квэст-экскурсія **"Легенды і паданні Мірскага замка".**
• Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **"Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце", "Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст.", "Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст.", "Печы з каробкавай кафлі XVI–XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў".**

УНП 590201541

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8,
тэл.: 8 017 2030792, 8 029 1440792,
8 017 3271166

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Інтэрактыўная праграма **"Крылатыя абаронцы Радзімы"** на пляцоўцы каля легендарнага самалёта "Лі-2". **Кожную суботу і нядзелю па верасень.**
• Выстава **"Савецкая ваенная форма і знакі адрознення (1920–1950-я гг.)" з прыватнай калекцыі. Да 8 чэрвеня.**
• Часовая выстава **"Слова пра Героя"** да 89-й гадавіны заснавання звання Героя Савецкага Саюза і Дня Перамогі. **Да 31 мая.**

У продаж паступілі сертыфікаты на наведванне музея з экскурсіяй і без яе. Ёсць абанементы: "Сямейны", "Дзіцячы", "Для старшакласнікаў і дарослых".

Падрабязнасці на сайце warmuseum.by.

УНП 100235472

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47,
тэл.: 8 017 2427814,
час працы: аўторак – нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Экспазіцыя **"Золак, убачаны здалёк". Да 11 чэрвеня.**
• Персанальная выстава Таццяны Савік **"Void/Пустата". Да 4 чэрвеня.**
• Персанальная выстава Марыны Трус **"Каб ніхто не застаўся без роднай кветкі, калі прыйдзе час". Да 4 чэрвеня.**
• Персанальная выстава Лізаветы Янковай **"Час пазначыць герояў". Да 4 чэрвеня.**
• Персанальная выстава Дарыны Даўгадзілінай **"Стыхія". Да 4 чэрвеня.**

УНП 192543414

Міністэрства культуры

да Дня абароны дзяцей праводзіць дабрачынную акцыю па закупцы піяніна "Беларусь" для арганізацый культуры і ўстаноў адукацыі ў сферы культуры. Арганізатарам зʼяўляецца ўстанова адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў". Запрашаем паўдзельнічаць!
Рэквізіты для пералічэння грашовых сродкаў:
Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў",
Рэспубліка Беларусь, 220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.
BY93 AKBB 3642 9000 4629 3000 0000.
Банк: ААТ "ААБ «Беларусбанк»", г. Мінск, пр-т Дзяржынскага, 18;
БІК AKBBBY2X. УНП 100286677.
Акцыя праходзіць **да 25 мая 2023 года.**

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь

аказвае фізічным і юрыдычным асобам паслугі па рэстаўрацыі і кансервацыі ікон, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Тэлефоны: **8 017 3970163, 8 025 6677819.**

Наш Telegram-канал. Далучайцеся!

З пытаннямі размяшчэння рэкламы звяртайцеся па тэлефоне **8 017 2860797** або на электронную пошту **reklama@kultura-info.by.**

2006 2010 2022

КУЛЬТУРА

Сайт: kultura-info.by
E-mail: kim@kultura-info.by

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)

Выдаецца з кастрычніка 1991 года.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".

Дырэктар — ДУЛЕВІЧ Віктар Іванавіч.

Рэдакцыя газеты "Культура": Галоўны рэдактар — ДУЛЕВІЧ Віктар Іванавіч. Намеснік галоўнага рэдактара — ШЧУРОК Жанна Генадзьеўна.

Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ.

Рэдактары аддзелаў — Віктар ГАУРЫЛЬ, Яўген РАПІН.

Аглядальнікі рэдакцыі: Яўгенія ГАБЕЦ, Антон РУДАК, Ганна САКАЛОВА, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ, Данііл ШЭЙКА, Зміцер ЮРКЕВІЧ, Настасся ЮРКЕВІЧ.

Літаратурны рэдактар — Мацвей ЗАЙЦАЎ.

Мастацкі рэдактар — Марына ПЯРКОЎСКАЯ.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.

Тэлефоны: 8 017 2860797, 8 017 3345723. Тэлефон-факс: 8 017 3345741. Бухгалтэрыя: 8 017 3345735. Рэкламны аддзел: 8 017 2860797.

* — матэрыял на правах рэкламы.
© "Культура", 2023.

Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

Падпісныя індэксы: 63875, 638752, 63879. Ільготныя на паўгоддзе: 63872, 638722 (зніжка 15 %). Камплект (газета "Культура" і часопіс "Мастацтва"): 63874, 638742 (зніжка 10 %). Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 12.05.2023 у 18.00. Замова № 1060. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва «Беларускі Дом друку»". 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. Наклад 3001.